**Георгій Валкавыцкі**

# Ашчэпкі

*(1998-2000)*

Праграмная рада Тыднёвіка „Ніва”
Беласток
2002

Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji

Zrealizowano przy pomocy finansowej:

— Ministerstwa Kultury

— Zarządu Miasta Białegostoku

На вокладцы малюнак У. Тэрнера, на тытульных лістах яго фрагменты.

Набор і карэктура Віталь Луба

Афармленне Аляксандр Максімюк

ISBN 83-911514-9-2

Друкарня

„Offset-Print", ul. Broniewskiego 14, Białystok

# На абмежку

## Яна недзе ёсць

Мой унук Эрнік, першы кавалер дзіцячага садка, закахаўся ў суседку, вучаніцу першага класа. Закахаўся безнадзейна. Старэйшая на два гады суседка не хоча бавіцца з ім.

— Што рабіць? — сумуе малы.

— Кінь задаваку, — стараюся вывесці яго з хлапечай хандры. — Вунь, у пясочніцы, колькі харошых дзяўчатак. Выбірай. Кожная — прыгажэйшая за тую...

— Няма нідзе прыгажэйшай! — з плачам і кулакамі кідаецца на мяне.

Малайчына! Умееш пастаяць за свой ідэал. Палагоджваю канфлікт пакаленняў:

— Тады мусіш чымсьці спадабацца ёй, — кажу.

— Але чым? — бездапаможна разводзіць рукі.

Каб я ведаў густ тваёй абранніцы! Але не ведаю. Застаецца універсальная слабасць — ласункі. Таму і кажу:

— Паспрабуй прываражыць цукеркамі.

— Ідэя! — уцешыўся ўнук. Схапіў пачак „каровак" і пабег на двор.

Вярнуўся з маркотнай мінай:

— Цукеркі з'ела, а бавіцца не хоча.

Значыць, прычына глыбейшая, дзяўчынка не шалахвостка, кіруецца дальнім разлікам.

Было лета і я меў водпуск. Ужо старэў, не цягнулі ні горы, ні мора. Нават Памора, крыштальная казка Аўгустоўскага паазер'я, мая прывольная Яцвягія, не вабіла. А водпуску многа, адрабляю неадпачытае з мінулых гадоў. Паеду над Нараў, у Плёскі: якраз выдавец заснаваў там фірмавы летнік. Галоўнае — блізка. Узяў я з сабою дачку і ўнука: хай астыне хлопец ад непрыступнай суседкі. Але не паспелі мы асвоіць вакацыйную хатку, як прыбягае Эрнік з нечаканай навінай:

— І яна тут!..

Суседнічалі з дзіцячым лагерам. У ім і высачыў унук сваю багіню.

— Пайшла на рэчку купацца, — кажа. — Ідзем падглядаць, — цягне за руку.

Што ж, ідзем. Тупаем да купальні дзікім, зарослым кустамі берагам Нарава. Бераг абрывісты, унук гарачыцца, баюся, каб не зваліўся ў раку. І прыходзіць у галаў блазенская думка. Моцна трымаючы гарцуна, кажу:

— Вось зараз вазьму і скокну ў раку.

— І што будзе? — цікавіцца ён.

— Утаплюся.

Думаў, што пасля такой заявы Эрнік пачне адводзіць мяне ад самагубнага ўчынку.

Тое, што пачуў, зусім збіла мяне з тропу:

— А хто завядзе мяне да мамы? — жахнуўся ўнук.

Забыў нават куды ішоў.

Зрабілася на душы сумна: не шкадуе дзеда. Хочаш тапіцца — твая справа, але перад гэтай паказухай адвядзі мяне да мамы. Ну, але тут мая віна, не трэба было ставіць хлопца ў дурное становішча.

На сямейных адносінах берагавы эпізод не згуляў адмоўнай ролі, а ўнук неўзабаве сагрэў маю пасмутнелую душу гарачым цяплом. Скончылася лета ў Плесках, а адпачынкавыя хвасты не адроблены. Нудна сядзець у хаце, схаджу ў рэдакцыю. Унук ідзе са мною. А па дарозе міжнародная кнігарня. Ніколі яе не прамінаю. Зойдзем, пагля-дзім навінкі. У сярэдзіне многа наведвальнікаў. Прабіраюся да бела-рускай паліцы. Па вокладках бачу, прыйшло добрае папаўненне. Па-стой, Эрнік, а я пагартаю. Калі адарваўся ад паліцы, абліўся халод-ным потам: няма Эрніка! Пытаюся ў прадаўшчыцы, ці не бачыла пяцігадовага хлопчыка. Выйшаў з нейкім дзядзькам, кажа. Непры-томны ад жаху, выбягаю на вуліцу. Ні дзядзькі, ні Эрніка. Кідаюся то ў адзін, то ў другі бок, заглядаю ў пад'езды суседніх дамоў, нідзе няма. Нявед чаго брыду ў кірунку рэдакцыі. Што скажу Веры? А што дачцэ?! Расступіся зямля, стрымгалоў кувыркнуўся б у збаўчую без-дань. Але зямля цвёрдая, а ногі з кожным крокам мякчэюць. Куды я іду?..

Ажно насупраць чырвонага касцёла — цуд: Эрнік цягне за руку Веру, паганяе яе, аж змакрэў чубок на ўзбуджаным тварыку. Яшчэ мяне не бачаць.

— Эрнік! — задыхаюся ад шчасця.

Эрнік спыніўся. Утаропіўся ў мяне, як у прывід. Мой залаты хлопчык!

Што здарылася? Спрацавалі роднасныя імпульсы. Унучак у набітай кнігалюбамі кнігарні менш цікавіўся дзіцячымі кніжкамі, каля якіх я яго паставіў, чым людзьмі. І спіна аднаго вялікалюды, што праціскалася ў цесныя дзверы на вуліцу, выдалася яму дзедавай, і ён

падаўся следам. Выйшаў на тратуар, а дзед як растварыўся. І хлопец папёр у рэдакцыю. Прапаў дзед! Схапіў бабульку за руку — і бягом, выручаць дзеда!

А што з багіняй? Упадабаў другую — дзяўчыну з кардонкі Lego:

— Падрасту, паеду шукаць яе, — прызнаўся. — Ну, бо недзе ж яна павінна быць.

— А як жа ты знойдзеш яе? Свет такі вялікі.

— Вазьму з сабою Lego і буду прыглядацца да дзяўчат.

А колькі год маляванка бадзяецца па зямным шарыку?

Мо ўжо ператварылася ў Бабу-Ягу і толькі расстаўляе пасткі на Чырвоную Шапачку? Гэта ўнука не цікавіла. Не цікавіў яго і тэрмін адысеі, на які ў радасным азарэнні прызначыў сябе. Яна недзе ёсць. І яна чакае мяне. І я знайду яе.

У мроі вочы зашторана.

## Шукальнік алмазнага свету

Рыбалы — вялікая прыходская вёска: дзве царквы, школа, гурт спевакоў „Хлопцы-рыбалоўцы”. У бруйныя пяцідзесятыя гады гаманлівая, цяпер — аглухлая (за выключэннем памянёных „хлопцаў”), апусцелая — глядзіць бязмэтна шэрымі шыбінамі даўно нямытых вокан, за якімі затаіўся адлеглы час. Кожны раз едучы ў Беласток, лаўлю гэты шчымлівы позірк — у ім дакор і ў мой адрас. Маё пакаленне звышпрычыннае да адліву з нашых вёсак людскога гоману. Віну прымаю, грэх — не. Не ўкладваецца ў заганны ўчынак. А што нам было рабіць, кішэць у гнойнай бытавусе? Ішлі ў горад. Адны на працу, другія на вучобу. Як правіла, у бацькоўскія парогі не вярталіся. Вось і Рыбалы бязлюдзелі, выраджаліся — і цяпер сіратліва зіркаюць пустымі вокнамі.

А мне здаецца, што ў сумна-зашклёных праймах спарахнелых сцен кучаравіцца дапытлівая галоўка Валодзіка Паўлючука: знайшоў у агародзе зачараванае шкельца і бачыць у ім зманлівае ваколле — не тое, у якім жыве.

15 лютага 1958 года я са сваёй калегіяй гасцяваў у рыбалаўскай школе. Народу сабралася шмат і гутарка вялася талковая. Мы зандзіравалі чытачоў, яны рэдактараў. Высвятлялі ўзаемныя адносіны, раіліся. У перадыху кранулі гісторыю — даведаліся, што да вайны Рыбалы славіліся зладзеямі.

— А што, цяпер няма іх? — цікавімся.

— Няма, — чуем. — Усе падаліся ва УБ.

Значыць, тутэйшыя зладзеі мелі нацыянальную гордасць. Даверліва гаманілі. Узніклі і цяжкасці. Васіль Баршчэўскі, наш парторг — лявацкі сверб! — абмяняўся поглядамі з мясцовым бацюшкам. Ледзь развялі.

Тут і сустрэў я ўладальніка зачараванага шкельца. Валодзі — ужо Уладзімір, заадно і вясковы бібліятэкар. Вось адкуль у нашага карэспандэнта салідныя літаратурныя веды! Вядома, згуляла сваю ролю і чарадзейнае шкельца — хлопец з бачным позіркам і непадробным почыркам. У 1964 годзе, калі ён працаваў ужо ў „Ніве”, уразіў нас мройным Дзямянам са Старой Вёскі.

Аблашчаны ўвагай вяскоўцаў, Дзямян запрагнуў ананімнасці, зняўся з наседжанага гняздоўя і ўшыўся ў гарадскі мурашнік. Уцякаў ад суседскіх вачэй у вольную волю, а тут мітусня, бездапаможнасць, і ты ўсім чужак, безыменны мураш, круглы нуль. Скрушаны, стаў загубленым чалавекам.

У спрэчкі кінуўся ўвесь ніўскі авангард. Змагаліся паўгода. Няма ў нас Дзямянаў — заявіла большасць. І Старыя вёскі зніклі! Пагадзіў усіх Дзядзька Квас. Прызнаў адступніка і даказаў, што ягонае месца на бязлюднай выспе.

Сам жа віноўнік палемічнай бойкі без асаблівых згрызот развітаўся з роднай вёскай, ад свайго лёсу не ўцякаў. Углыблены ў нацыянальнае існаванне, распрацоўваў беларускую тутэйшасць, разбураў аджыўшыя стэрэатыпы, ляпіў новыя, рабіў высновы, назапашваў творчую амальгаму. І заззяла адметным бляскам чарадзейнае шкельца, здзівіў чытацкі свет „Вершалінам”. Умеў Валодзя карыстацца цудоўнай знаходкай.

Міжволі думаю, што ён яшчэ ў нашым даўгу. Што верне Дзямяна на старавясковыя гоні, дапіша жыццёвы лёс загнанага вяртанца. Бачу гэты акт. Колішні нівец з акадэмічнай бародкай вешае на саноўны карак выслужаны фотаапарат і едзе ў Старую Вёску. Не даязджаючы, спыняецца ля бульбянога поля, падыходзіць да найбліжэйшай капальніцы і цікавіцца сялянскім бытам:

— Як жывецца? — пытае.

— Цяжка! — з убітым у зямлю зрокам, адмахваецца кабеціна.

— Нам усім цяжка, — з філасофскім поглядам на справу суцяшае яе гарадскі прышэлец і кіруе ў другі бок, да аратага, з выгляду вылітага Дзямяна. Даганяе яго бабская гаворка:

— Волька, хто гэта?

А Волька, не адгінаючыся ад матыкі, адгукаецца:

— А, якісь дурны пан. Павесіў на пузе біскучую цацку і кажа, што яму цяжка.

Гэта не ўява. Так было ў дзіўную гамулкаўскую пару шасцідзесятых, калі мы, новая калегія — і Валодзя ў ёй паўнапраўны член — вывучалі ў пленэры абноўлены сялянскі быт. Валодзя не расставаўся з фотаапаратам, лавіў момант. Я любіў такі ўлоў і даваў лаўцу першыя старонкі „Нівы”. Заахвочваў і іншых шчалкапёраў ісці следам. Пераўзысці Валодзю ніхто не змог. І не так з прычыны прафесійнай нямогласці, як з-за фанабэрыстага нораву нашых людзей: з'ява празаічная — амбітнасць. Калі ўжо хочаш фатаграфаваць мяне, то, будзь добры, пачакай, пакуль я памыюся, пагалюся, улезу ў святочную апранаху і сам выбяру месца фіксацыі падзеі. Можна і на трактары, але абавязкова з медалём на грудзях і дыпломам ударніка ў руках. Ведайце нашых! Толькі не на фоне старой хаты ці пахіленага плота. Вось ля Майсеневай забягалаўкі — іншая справа. Стандартная? Але новая. Прагрэс!

Як ні дзіўна, але „прагрэсісты” цюцелька ў цюцельку траплялі ў ацэначныя лінзы ахоўнікаў ідэйнай чысціні. Пакажаш на прызбе старэнькай хаткі дзядулю з рэзбленым гадамі тварам — ага, настальгія па клятым мінулым! Дасі голенькага карапуза на пясчанай дарозе — ага, намёк на беларускі лёс у ПНР! Ці ж у нас ужо і адзення не хапае? Што скажуць у Амерыцы!

Правільна, амерыканскі кантаслуп з роднаснай матэрыі, паказвае тое ж самае. Завёз Лёнік за акіян высечаны лес, адны пянёчкі. У друку карціна патлумачана: „Высечка беларускай культуры”. Тлумачыў збеглы чэкіст? З ім не засумуеш.

Ну і хай кажуць, хай тлумачаць, калі яны касавокія. Мы ж робім „Ніву” не для іх. Аказваецца, і для іх. Яны таксама ловяць момант.

Куды я гну? Наш прафесар не паедзе ў Старую Вёску. Ён убачыў, куды ідзе караван — плаўна віруе ва універсітэцкіх аўдыторыях і замест праміналага часу, ачольвае новыя плыні. Ці не таму загадкава ўсміхаецца да нас з блакітнага акенца беластоцкага тэлецэнтра? Мо ўжо забыў спарахнелыя сцены і агарод, у якім знайшоў зачараванае шкельца? А мо яно ўвесь час з ім? Толькі дзе тая Старая Вёска? Зарасла крапівою.

## Крылатыя словы Барскага

Яны нарадзіліся ў блаславёны час нашага літаратурнага Big Banga, калі для паэтаў „Руні” вясковыя асілкі знімалі дзверы з клуні, а бельскія ліцэісткі прысвячалі Барскаму свае першыя лірычныя парывы.

І паэт не заставаўся ў даўгу. Пад шквал авацый, укантэнтаваны прызнаннем удзячнай публікі, сходзіў з узнёслай гарызанталі прыгуменных дзвярэй на грэшную зямлю, выбіраў з бязлікага натоўпу спелую папялушку, высвятляў сэрцаедным зрокам стан ейнага нутра і, адчуўшы асалоду ад душэўных пакут ахвяры, ускрыляў яе трапятлівым словам:

— Я вас кахаю!

Тут, не спускаючы з папялушкі намагнічанага эротыкай позірку, рабіў спазматычны перадых і, надаўшы голасу глыбока асабістага зместу, прыкідваўся няўцямным цнатліўцам:

— А вы мяне? — ні то пытаў, ні то прасіў.

І здзяйсняўся цуд. У адно імгненне сціплая папялушка ператваралася ў распаленую каралеўну, прыкметна прыгажэла, млела ад будучага шчасця і палкімі вачыма адказвала:

— Я твая, князь!

Зварушлівыя словы паэта — як лагічнае спараджэнне разбуджанага Пачыну — набылі сілу дэвіза, сталі праграмнай ідэяй, і вабная палова абарыгеннай нацыі лягла вакол рэзвых ног будзіцеля.

І ўспомніўся іншы паэт:

— Я вас любил, — сказаў задуменна Аляксандр Пушкін, кіруючы настальгічную фразу няздзейсненаму каханню — і ўся прыкультурная Расія ахнула ад душэўнага болю, прычыненага паэту няўдзячнай велікасвецкай шалахвосткай. Наш Аляксандр на жаночым фронце не ведаў горычы паражэння. Не карыстаўся і прошлым часам. Атрымаўшы ад прыроды ўнушальныя вонкавыя і ўнутраныя стымулы, прызнаваў толькі цяперашні час. І плыў ад сэрца да сэрца. Сэрцалюбную эстафету значыў на літаратурных старонках „Нівы” і ва ўтоеных лістах прылашчаных спелак, зайздросных пераспелак і слёзных недаспелак.

У гэтай сферы Барскі быў непераўзыдзеным артыстам, і эліта мясцовых казановічаў, не гаворачы пра паспалітых казанюкоў, не адважвалася пераймаць вопыт майстра. Барскі не падлягаў штампаванню. Ляпіла яго неба экспромтам, у разгары херувімскай сябрыны. Дэміург, кульнуўшы добрую чарку, змяшаў зямную гліну з нябеснай. Таму і стаў Барскі непераймальны, боскі. А той, хто пасягае на боскае, выставіць сябе на смех, як Сваяк пад Цілічанкай.

Было так. Стаяла пагоднае лета і мы, ніўцы — Уладзімір Паўлючук, Сакрат Яновіч, Сваяк і я з Сідарам — гнаныя прагай вывучэння роднага краю, выбраліся ў Кнышынскую пушчу. Да Супраслі даехалі рэйсавым аўтобусам, а там рушылі пешкі. Узялі напрамак на Каралёў Мост. Пакуль ішлі цёмным лесам, ні кудлатага лесуна, ні

гарбатай ведзьмы не спаткалі. А пад Цілічанкай залаты бор, казка, і між гонкіх соснаў набрынялая маладымі сокамі папялушка.

Абступілі скараспелку. Пачалі абходжваць. Валодзя, які выношваў канцэпцыю абарыгеннай псіхалогіі, падышоў да склаўшайся сітуацыі па-філасофску: убачыў у папялушцы частку акаляючай прыроды, гармонію зместу і формы — і павёў гаворку аб узаемнай адпаведнасці частак цэлага. Сакрат, заядлы рыбак, ломіць галаву над рычагамі, якія ўключылі б рыбныя запасы глеістага раўчака, што чарнее непадалёку, у задавальненне патрэб мясцовага насельніцтва.

— Які а..а...сартымент рыб водзіцца ў ім? — выпытвае, прагна заікаючыся.

— Сартымент? — здзіўляецца папялушка. — Чаго?

— А...а...а... — давіцца Сакрат казённым словам, уганяючы папялушку ў разгубленасць, і яна зіркае на мяне. Я прыняў паставу загадкавага маўчуна. Яна зірк на Сідара. А ён валяе дурня, мацае ўчэпістым зрокам узбуджанае цела папялушкі і нахабна ўсміхаецца з анексійным намёкам. Пікавае становішча. І тут Сваяк — ні з таго, ні з сяго — сячэ Барскім. З ходу карцела вылучыцца ў князі? Баяўся, каб Сідар не апярэдзіў?

Наспех развучаная роля прывяла да адваротнага ператварэння намеру ў скутак. Выйшла, як на аматарскай сцэне. Ад спешкі ніўскі казанова страціў прыпісаны герою лірычны тон і ў яго голасе, замест шчымлівай тугі і радаснага спадзявання, узарваліся ўсе рэсурсы цялеснага жадання. Агаломшаная малодка спярша налілася сарамлівай чырванню, затым у вачах яе ўспыхнула поўнае недаўменне, быццам убачыла згаладалага сексуальнага вампіра.

— А Божачка! — ахнула, млеючы ад жаху.

І Сваяк, згараючы ад канфузу, кінуўся з усіх ног у лес. Толькі рэха рагатнула ўдагонку:

— Здурэў дзядзька!

Пераймаць Барскага? Лягчэй праз зямлю праваліцца. Застогнеш ад душэўнага болю і яхіднага рогату кплівых хаўруснікаў. І станеш блазнам.

Банальная ісціна, банальны хэпі-энд.

## Твая любоў – твая загуба

### 1

Да вялікага ліцвіна завёў мяне італьянец Амічыс, аўтар гулкага Сэрца, якое праменіла на мае юныя гады, штурхаючы на дарожныя знаёмствы. На беразе Свіцязі навагрaдскі прарок сказаў мне:

— Кіруйся сваім сэрцам. Яно — твой правадыр.

І я паверыў паэту. Узяў напрамак на ўказку. А што ў гэты час рабіў розум? Куды дзеліся вочы? Розум змоўк, а вочы пачалі фокуснічаць: бачылі то руж, то чэрнь — іншыя колеры зніклі. Пачаў я не пазнаваць і рэальнасць, у якой жыў, і абставін, з якімі зжыўся, і людзей, якіх, здавалася, ведаў. Свет мо стаў і цікавейшым, але як бы зышоў з наканаваных віткоў. Тут і падаспеў хітрамудры Ідальга. Не адну зламалі піку. Ветракоў хапала.

2

Неразважны Германюк падгаварыў Шаховіча, здавалася б разумнага журналіста, пададэкватніць роднай вёсцы шыльду. Кастусь Майсеня, тадышні сакратар ГП БГКТ, даў камандзіроўку і сродак транспарту. Селі актывісты ў гэпісцкую карэту і (ту-ту!) кіруюць у Доўгі Брод, на братняе памежжа.

Мігам сабралі сход, выступілі з палымяным словам — і за справу. Знялі польскую (дзяржаўную) шыльду, замацавалі беларускую (сваю) і змыліся. А вясковы унтэр Прышыбееў — бах! — рапарт у нядрэмную службу: дыверсія!

Нарад нядрэмных, абследаваўшы месца злачынства, высветліў: Германюк з Шаховічам перасунулі ў Нехрысць Польшчы дзяржаўную мяжу. І да мяне: „Пакараць Шаховіча!” Я да Шаховіча:

— Якога чорта перасоўваў мяжу?

— Не перасоўваў! — адпіраецца.

— Не вінаваты Шаховіч, — кажу нядрэмным.

— Вінаваты, — кажуць яны. І тыц мне пад нос рапарт унтэра.

— Дык дайце гэты дакумент. Не магу караць без удакументаванага доказу.

— Не дамо.

— Тады зробім канфрантацыю.

Прытураю з суседняга пакоя дыверсанта. Той выкручваецца вужом і перад нядрэмнымі. Такім чынам выбівае з маіх рук падставу ўляпіць страгача. А рукі свярбелі.

3

Яшчэ няраз добрасуседства адгукнецца Доўгім Бродам. „Беларусы перасоўвалі граніцу! Далучаліся!” Колькі іх было? Няважна колькі. Хай нават „перасунуў” мяжу Прышыбееў. Знайшлі матэрыяльны доказ? Знайшлі. Намер праваліўся? Ну і што! Былі? Былі. Выступалі? Выступалі. А што наляпалі? Перайменавалі „Długi Bród” на

„Доўгі Брод”. А такія знакі дзе? На Беларусі. А Германюк хто — германец? А Шаховіч — персідскі шах? Беларусы перасоўвалі мяжу.

4

Вам дзіўна? Мне таксама. Хоць здзіўляцца няма падстаў. Нядрэмныя глядзяць на нас праз лагічны кантаслуп. Бо іх вучаць логіцы. У Прышыбеевых гэты прыбор прыродны, у шэрым рэчыве. Таму не выпучвайце вачэй, калі сусед мусоліць вас вітальнай брамай 1939 года. У яго зрашэчаная памяць — забыў, што ён таксама браму ставіў, шанаваў спрадвечны звычай. Каталіцкі Кракаў вітаў напаўпаганскага Ягайлу, Радзівіл — шведаў, цымбаліст Янкель — Напалеона, Алесь Гарун — Пілсудскага. У гэтай традыцыі і драбніца добрасуседскіх пачуццяў. Відаць, за пагром у Старым Беразове новаберазоўцы ўшанавалі Dziadka помнікам. Магчыма, у мройных снах суседзі расстраляных вазакоў Прыбелавежжа здабываюць бронзу для „Бурага”. Ужо ў Пушчы ўганараваны жалезным крыжам нямецкія вешальнікі. Такая логіка нашага жыцця.

5

Сідар кажа: — Ва ўсёй гэтай мітусні вінаваты вялікі ліцвін. Заклікаў жа:

— Miej serce i patrzaj w serce!

Вось і нашы хлопцы глянулі ў цудоўны твор прыроды. І ўбачылі сябе вялікімі сынамі. Пяройдзем у вякі! Наша справа пачаць, а там — як неўзабаве адгукнецца галосны сэрцагляд Перабудовы — працэс пойдзе. А дзе вочы? Дзе розум? Спіць. Неактыўны дружбак. Актыўная воля! Яна асновай усяго. З зачаткавых нетраў сярэднявечча вызірнуў блажэнны Аўгустын, вучоны муж, іерарх сэрцаглядства. Во якія глыбокія карані. З іх і вырас Міцкевіч — з перавагі ірацыянальных сіл душы над розумам. Калі сціснуць квяцісты тэзіс Аўгустына, выйдзе, што і ў Міцкевіча: „Глядзі ў сэрца і слухай сэрца!”

Трэба меркаваць, старажытны мысляр не пазычыў фразу ў нашага земляка. Хто ж тады падвёў мяне і нашых хлопцаў?

## Дарунак восьмага неба

Міжбугаодэрцы вераць у сваю гасціннасць, як у Каралеву Чанстахоўскую.

— Няма шчадрэйшых людзей у свеце! — ціснуць на пляменную псіхіку родавыя магі.

Дзеля чаго? Унушэння выключнай ролі? Комплексу пакрыўджанасці — свет нас не разумее?

І нашы палітыкі — белыя, чырвоныя і мутанты — пратрубілі Клінтану вушы:

— Мы спадчыннікі готаў, у нас з вамі агульная мэта. Мы найнай... І „най” — белы папа наш... Да Папы! Да Папы! У Нью-Йропу!

Толькі зялёныя, карычневыя і чорныя насуплена ашчэраны. І гэтым насцярожваюць еўратузоў:

— Прымаем жа вас! — тлумачаць няўседлівым занудам. — Міжбугаодэрлянд першы ў чарзе. Langsam! Пашырым суполку. Падзелімся спадчынай. Толькі не ідзіце да нас, спадчыннікі, з песняй: „Ne bendze Nemec pluł nam w twaz...” Verstehen? Langsam, aber gut! Або, як кажуць у вас: Pomalu, no koroso!

— Толькі без злога джына! — узмаліліся нашы дзяржаўныя еўрыкі. — Да млоснасці абрыдлі слінявыя зяпы і ўчэпістыя абдымкі касалапага Мішкі. Баімося каварных азіятаў!

А баяцца няма чаго. Жывуць там сапраўдныя хлебасолы. Рускі з голаду пamрэ, а суседа накорміць. Сам замерзне, а цябе абагрэе „Ямалам”. Грузін ні за якія скарбы не выдасць ворагу госця. А што казаць пра сярэдніх азіятаў! Распавядае Барыс Руско, колішні ракетчык: Палкоўнік, маёр і я (тады капітан) прызямліліся на палігоне NN пад блакітным казахскім небам. Выпусцілі ў бок вераломных кітайцаў рэактыўнае свінчо і пайшлі ў суседні калгас знаёміцца з тубыльцамі і іх звычаямі.

Сустрэў нас старшыня калгаса Сара Сарабаеў, прыняў як родных братоў. Паказаў сваю вотчыну, зарэзаў тлустага барана, завёў у спадчынную юрту, пасадзіў на ганаровыя зэдлікі, узяў у рукі дамбру, — ён і акын, па-нашаму бард, — ударыў костачкамі пальцаў у дзве струны (больш струн інструмент не меў) і ўрачыстым тэмбрам праспяваў вітальную песню. Пачыналася яна прыблізна так: Вітаем, вітаем Вас, Госці дарагія! Жадаем, жадаем Вам, Вечна з намі жыць!

Песня доўжылася, таму запамятаў я толькі пачатак. Услаўляла польскіх ракетчыкаў — „непахісных стражнікаў непарушнай Варшаўскай дамовы”.

Рамантычны настрой падтрымлівала жонка Сарабаева, яшчэ даволі рухавая і не надта каб старая. Яна завіхалася каля стала: расстаўляла ёмістыя бутлі градуснага кумысу, абкладала іх „мікіткамі” (кукурузнымі праснакамі) і дарамі Іртыша: асятрынай, нельмай, муксунам, чэбакамі. Напітак і ежу падносілі дочкі — старэйшая, ужо ў гадах, і васемнаццацігадовая — лебядзіны цуд восьмага неба.

Калі гаспадынькі вычаравалі абрус-самабранку, лірыка ўкрапілася ў эпіку. Уважлівы гаспадар стала прапанаваў першы тост выпіць за „доблеснае Войска Польскае і вечную дружбу”. Выпілі і закусілі асятрынай.

Другі тост гаварыў наш палкоўнік. Выпілі за гаспадара, дбайнага ахоўніка праслаўтай сярэднеазіяцкай гасціннасці і за цудоўных жрыц сямейнага ачага.

Потым пілі за радзіму — адну, другую, агульную — за ўвесь прагрэсіўны свет і ягоную сталіцу. Закусвалі дарамі Іртыша, каўказскім шашлыком і „мікіткамі”.

І наладзілі айтыс „Блакіт-00”, песеннае спаборніцтва. Гаспадар славіў ураджай, гаспадыня мір, мы, вядома, ваенныя дарогі. Усіх пераўзышла „Ракетка”, як мы ахрысцілі васемнаццацігодку. Плаўнымі крочкамі абкружыла яна сябрыну, узляцела на свой зэдлік і пранікнёна праспявала пра каханне. Мы апладзіравалі ёй стоячы.

Селі, выпілі за заваёўніцу цвёрдых салдацкіх сэрцаў і запілі зялёным чаем.

Весела пілося і елася. А калі накумысіліся, нашашлычыліся, намікіціліся, наайтысіліся — гаспадар узняў пытанне дастойнага адпачынку.

— Гонар спаць з маёй жонкай даю палкоўніку! — урачыста аб'явіў ён, з гордасцю бліснуўшы шчаслівымі зрэнкамі. — Да старэйшай пойдзе маёр, — працягваў расстаўляць нас па рангах. — Капітан, прашу прабачэння, ляжа з „Ракеткай”. Выказаўся ясна? Дык да заўтра! Пара...

Мы аслупянелі. Убачыўшы нашу нерухавасць, Сарабаеў вылупіў на нас сярэднеазіяцкія вочы:

— Али русский язык непонятный?

Палкоўнік спрабаваў дыпламатнічаць. Маўляў, мы б з ахвотай, але прысягалі жонкам на вернасць. Дый служба не дазваляе.

— Падумеш, рыцары! — сарамаціў нас пакрыўджаны казах. — Прысяга! Вернасць! — учапіўся за словы палкоўніка, пераходзячы на „ты”. — Я ж табе даю сваю жонку толькі на адну ноч, а не на пажыццёвае карыстанне. Я — што, няясна выказаўся? Плюю на ваш звычай! Ты ў маёй юрце, дык, будзь чалавекам, шануй нашы звычаі! — наступаў. — Які-небудзь клёк маеш у галаве? — асведамляўся — Якая ганьба, якая няслава! — захліпаючыся ад крыўды, галасіў. — А калі ты асарамаціў мяне, ушануй прынамсі мой дом! — павучаў.

Ніякія аргументы Сарабаева не пахіснулі прынцыпу палкоўніка. Хоць быў ён пад градусамі, цвёрда стаяў на нашых вартасцях. Выбуховую сітуацыю разрадзіў камендант стрэльбішча. Занепакоены

зніккненнем саюзных афіцэраў, пусціўся ў пошукі. Ён і ўціхамірыў раззлаванага ахоўніка мясцовай традыцыі. А ці абразуміў? Наўрад. Калі мы развіталіся, у агніста-чорных зрэнках нашага дабрадзея палымнеў душэўны боль:

— Я — азіят! Так?

Пытаеш, як у гэтай сітуацыі чуўся я? А як можа чуцца бравы маладзец, у якога з-пад носа сцібрылі дарунак восьмага неба?

**Трасуны**

Над Пушчай бесперастанку гудуць прыбойным рокатам рэактыўныя мастадонты. Паветраны калідор. І хочацца мне на крылах з маладых сноў узняцца на строга вызначану сонечную трасу і зірнуць у вочы паднебных трасуноў і спытаць у твар:

— Куды трасецеся, загуджаныя?

Ведаю, трасунам не да мяне. І яны, канструктыўныя винтики рэальнай стадыі, убачыўшы зарэжымленую зямлёй небрыдзь, гаркнуць на манер маёра Шцірліца:

— Не твое дело!

І гудануць мацней, скручваючы на Буг, і я распластаюся ў белым шлейфе над Шведавым Морам, і толькі Віктар у развітальным вершы адзначыць маё падзенне.

Хочаце верце, хочаце — праверце, але я каторы раз шлю ў думках шчырую ўдзячнасць пільнаму купцу паветраных сіл сорак пятага года, які валявым рашэннем не прапусціў мяне, аздобленага нялётным грыфам „Быў у акупацыі”, у гэтыя сілы. Трапіўшы туды, навек зарваўся б у загуджаны тарантас — я ж рваўся ў паветраную гільдыю.

— Удзячнасць выказвай роднаму Сталіну, — устаўляе свае тры грошы Сідар. — Купец выконваў ягоную волю.

Так і быць.

— Дзякую, Бацька, за тваю празорлівасць, за твой сакаліны зрок. Твая рацыя, винтик з мяне нікудышны. Дзякую, Мудры, што не выбраў мяне ў глуміцелі кучаравай зямлі.

— Няўжо, працінаючы Белавежжа, апаражняўся б ты над цудам прыроды? — лезе ў душу Сідар. — Няўжо не растварыўся б у абдымках кучаравай?

— Мер...за...вец! — шыпіць хрыпліва з халодных віткоў Патойбаковіі прастуджаны ўладны голас.

— Хто мерзавец, я ці Сідар? — гукаю з бяспечнай геапатагеннай зоны.

— Шкура! — шыпіць далёкае бязмежжа. — Конъюнктурный флюгер!

Абудзіў дэмана. Бач, прасвідраваў мяне з гэткай далечы. Як сталічныя актывісты ў час ідэйнага пастраення БГКТ. Никто не забыт, ничто не забыто. Ты ўсё на эмоцыях. Не трэба так катэгарычна. Даруй крыўду, ляпнуў здуру — расказарміўся язык у тваю ^прысутнасць. Не хвалюйся, усё будзе па-твойму. Спі.

— Ты ў мяне яшчэ запляшаш! — паабяцаў вярхоўны, падмацоўваючы сказ ненарматыўнай лексікай, пернуў турбарэактыўным газам і скрыўся ў хмарах. Узяў курс на Гаагу?

— Тру-бі ў свой бок! — адгукаецца далідальняе рэха. — Тру-бі ўбок!.. Та-кі-я спра-вы... спра-вы... пра-вы...

Па-над небакраем плыве гул грознай ростані.

## Ваенная хітрасць

Наша рота спынілася ў толькі што ачышчанай ад немцаў вёсцы. Вяскоўцы сядзелі яшчэ ў лесе, чакалі зручнага моманту для вяртання ў свае сялібы. У вёсцы застаўся толькі адзін гаспадар. Не здолеў ён вывезці ў лес неабходных жыццю набыткаў. Пільнаваў скарб на месцы. Хата гэтага гаспадара стаяла блізка гасцінца і ў ёй размясціўся наш штаб.

Штабісты, да якіх, як сувязны камандзіра роты, быў прыпісаны і я, увіхаліся ўкруг новай стаянкі. І не так з патрэбы ўладкавання нескладанай маёмасці, як з-за зіркатай дачкі гаспадара, якая з паблажлівай усмешкай сачыла за нашым увіханнем. Была гэта даверлівая чарнавокая красуня. І хіба таму, калі мы закончылі работу, апынулася яна ў цэнтры нашай увагі. Адны напрошваліся дроў прынесці, другія — схадзіць па ваду, трэція проста расказвалі анекдоты. Адзін я маўчаў.

Відаць, маўклівай прысутнасцю крануў дзявочую годнасць, бо пачала яна зіркаць у мой бок какетлівым позіркам, а калі выходзілі з хаты, спытала:

— Чаму вы такі сумны?

— Вайна, — патлумачыў я ўхіліста.

Толькі паціснула плячыма.

На дварэ вясновае сонца. Па калдобістай брукаванцы грукочуць нагружаныя вазы. Вяртаюцца ў вёску ўцекачы. А старшы сяржант Капач адклікае мяне ўбок і кажа:

— Не ўлазь у дарогу!

— Ты здурэў?

— Спыніць гутарку. Ведаем такіх...

Якіх — не даказаў, але і так узяў з мяне слова, што заляцацца да чарнавокай не буду. Слова як слова, даў без торгу. Не выпадала з-за дзяўчыны настройваць супраць сябе не так ужо малы ў маштабе роты чын. Дый пры Капачу я не меў ніякіх шанцаў.

Раптам усё ўскладнілася. Раніцай узводы размясцілі па акрузе. Намячалася прачоска лесу. Капач са сваім падраздзяленнем пайшоў за лес. І ў гэтым заключалася складанасць — на месцы заставаўся я.

— Сцерва! — кулаком пагразіў мне адыходзячы Капач. — Трапіш у мае рукі, не прасі літасці.

Падвергнуцца Капачоваму гневу не давялося. Адвячоркам камандзір роты паслаў мяне ва ўзводы з данясеннем аб пачатку лясной аперацыі.

— Глядзі, каб не напароўся на немцаў, — перасцярог. — Помні пра заданне.

Ісці нанач пяшком не было ахвоты. І панскі тарантас з эпохі цара Гароха не выклікаў даверу. Паеду вярхом. У любых абставінах конь прыяцель чалавека. Пайшоў да конюхаў. А ў іх конскі санбат. Усе коні заезджаны. Выбірай, кажуць.

Выбраў найжывейшага. Выкапаны Расінант! Начапіў на худы хрыбет сядло, прыбраў іншай конскай збруяй, уладкаваўся ў сядле, а каняка апусціў маркотна мызу і ўтаропіў памутнелыя вочы ў зямлю. Здавалася, восьвось упадзе.

Усё ж такі пачаў перабіраць нагамі, і, адчуўшы тузанне павадоў, рушыў няроўным трухам. Два-тры крокі зробіць і спатыкаецца. Таму, зараз жа за варотамі, перайшлі мы на маршавы крок.

Але і гэты рух не абяцаў удачы. Сярод поля, калі вёска засталася за намі і наступаючы вечар падуў халодным дыхам, Расінант перастаў падпарадкоўвацца маёй волі. Упёрся лбом у дарогу і прагна смактаў раздутымі храпамі сыры пах зямлі. Не памагалі ні ласкавыя просьбы, ні дубінка, якую я прыдбаў. Расінант непарушна стаяў на сваім.

Злез я з сядла і пачаў разважаць, што рабіць мне з гэтым падлам. Кінуць, і ісці пешкі, не дазваляў закон. Гэта ж, як і аўтамат, што дындаецца на маіх грудзях, ваенная маёмасць. Трапіш пад суд. Ехаць на хабэце — не выканаць задання. Адышоў я да рова, сеў на ўзбочыне і скрунуў цыгарку. Хто каго! — вырашыў.

Расінант быў іншай думкі. Скубаючы астаўшыміся зубамі прыдарожную траву, павярнуў назад, туды, адкуль мы прыкандыбалі.

Устаў я, падышоў да каня, пагладзіў яго па сухім хрыбце, узяў за цуглі і, не адчуваючы супраціву, павёў да лесу. Пакуль мы туды дайшлі, наступілі поцемкі. Ад дрэў нясло прэлым мохам і панурай цішы-

нёй. Расінант прыпыніўся, паклаў на маё плячо свае храпы і дружалюбна залыпаў сумнымі вачыма. Я зразумеў, што прапануе пагадненне. Цяпер без вагання сеў у сядло і даў каню поўную волю. Кіраваць не мог, не бачыў дарогі.

З'явіўся месяц — і лес змяніў выгляд. Я пачаў кідаць па баках трывожныя позіркі. Мне здалося, што кусты рухаюцца. Чакаў адтуль стрэлу. Няважна, які куст стрэліць першы. Ну, страляй. А кусты маўчаць. Толькі бясшумна рухаюцца. Ні гуку, ні шораху.

Раптам спераду ўзвілася ў неба ракета. Нешта пачалося. Напружваю слых. Лаўлю нейкія дзіўныя моўныя камкі. Урэшце пачаў адрозніваць паасобныя словы. Каманда, не каманда:

— Левым!.. Пра-вым!..

І зноў ракета. Прашумела ледзь не над маёй галавой. І больш нічога. Каманда — перапынак — каманда. Хоць бы галінка якая трэснула. Складвалася ўражанне, што набліжаецца сам голас. Ніякіх прыкмет чалавечага руху. Вырашыў і я не рухацца. Зашыўся з канём у густыя кусты. Буду чакаць. Што будзе, то будзе.

І вось метраў трыццаць ад мяне вываліўся на дарогу павукападобны клубок. Яшчэ крыху і я пазнаў з'яву: Капач!

Ішоў басанож. Боты нёс у руках. Уся напруга лопнула і я зарагатаў на ўвесь лес. Капач анямеў.

— Вольна, старшы сяржант! — сказаў я, выбіраючыся на дарогу.

Капач, ачомаўшыся, змарсавеў і працадзіў праз зубы:

— Вязе ж табе, гад!

— Што ты пляцеш?

— Наплёў бы, калі б не апазнаў.

Капач паляпаў далоняй па ракетніцы, якая ўпіралася яму аж у пахі. І пачаў распытваць пра немцаў.

— Не бачыў іх, — кажу.

— Ты наогул нічога не бачыш, — узлаваўся ён. — Дык толькі што сюдою прайшлі.

Вось яно што! Капач, як і я, змагаўся з ценямі. І не стаў яго распякаць, толькі спытаўся:

— Тады навошта крычаў?

Выявілася, што ён прымяніў гэтак званую ваенную хітрасць. Каманда, якую падаваў, мела нагадваць начную аперацыю. Мэта: адстрашыць праціўніка.

— Гэта тактыка, — тлумачыў, адчуваючы поўную перавагу над някемным радавым.

Тактык з яго быў слабы, бо неўзабаве выдаў тайну: ішоў да чарнавокай. І гэтым у маіх вачах ператварыўся ў багатыра. Столькі перажыць страху ў імя сустрэчы з дзяўчынай? Якая цяга!

На жаль, я вымушаны быў паставіць яго ў рэальную абстаноўку, вярнуў ва ўзвод.

# Калі я быў не я

## ГУЛАГавец

Яе клікалі Зінкай, а яго — Жоржыкам. Недзе пад канец II Рэчы Паспалітай яны пажаніліся. Неўзабаве займелі сына. Заўсёды іх бачу разам. Ідуць з Падалян на Застаў, да бацькоў Зінчыных, бы выйшлі з казкі. Маладыя, прыгожыя, жыццялюбныя. Жоржык нацешыцца не можа першынцам, гоцае яго на адной руцэ, узнімае ўверх, вышэй сваіх кучараў. Глядзіце людзі, які ў мяне наследнік. Зінка, на ўсякі выпадак, страхуе. Неразлучныя, шчаслівыя.

І раптам, амаль у адначассі, памірае Зінчын бацька, гарыць бацькоўская хата (адступаючыя немцы падпалілі), пад Варшавай гіне брат, без вестак прападае Жоржык (Калыма?). Колькі гора звалілася на Зінку і яе маці! Пасяляюцца ў нас, у старой, „падалянскай”, прыгуменнай хаце. Чакаюць Жоржыка.

Скончылася вайна, усталявалася ўлада, а Жоржыка няма. У новай прышашэйнай хаце таксама чакаюць Жоржыка, свайго. І ад яго ни ответа, ни привета.

Настала лета 1946 года. Вяртаюся з далёкай дарогі. Да Гайнаўкі даехаў поездам, а чыгунку ў Белавеж узарвала dpan-kommando. Працуе аднак вузкакалейка. Усё-такі надзейны від транспарту. Ісці пешкі небяспечна, я ж у чырвонаармейскай форме. Напорашся на банду — прощай, Родина! Відаць таму, калі і злез з платформы на Грудках, не пайшоў шашою, а пакіраваў дахаты праз балацянку і поле. А далей, па-за агародамі, лугам. Вось і наша сядзіба. Памежнаю разораю — тры гады не таптаў яе! — тралюю да прыгумення. Мама мяне першая заўважыла. Бяжыць на прыгуменне і радасна вяшчае:

— Жоржык вярнуўся!.. Жоржык вярнуўся!..

Звабленыя воклікамі мамы, выскачылі са старой хаты нашы кватаранткі. Напаўпрытомная Зінка раскінула ўшыркі рукі, прэ да мяне і свету не бачыць. Абнімаць-цалаваць будзе?.. Што ў нас робіць Зінка?..

А яна падбегла і замерла. І я аслупянеў. У яе пакутна-няўцямных вачах чытаю: „Каб ты здох!”

За што? У чым я вінаваты?

Прыгаслая падыходзіць яе маці:

— Жоржыка не спаткаў?

— А што з ім?

— Рускія забралі.

Цяжка глядзець жанчынам у вочы. Даражэнькія, Расія-Матухна вялікая — с южных гор до северных морей! За якім морам, за якою гарою ваш Жоржык? Мне прыкра, што не спаткаў яго.

Ён так і не вярнуўся. А дакладней — з'явіўся толькі на міг, уяўны.

## Монтэкасінец

У бельскім ПУРы (рэпатрыяцыйная ўправа) выдалі мне прапахлы гнілым Захадам вайсковы шынель зелянковага колеру. Памацаў — добрае сукно. Засунуў руку ў кішэнь — нейкая пісулька. Адрас жанчыны з Новай Зеландыі. Во адкуль падарачак! Відаць, з палеглага мужа. Трэба падзякаваць, ды мовы англійскай не ведаю. Занёс шынель да Рыгаровіча, нашага краўца, які абшываў увесь Застаў і ваколле. Хапіла матэрыялу на шырокія, модныя ў той час, штаны і практычную, сцягнутую ў поясе на ўзор англійскі, фасоністую блузу. Ужо год у гэтым гарнітуры асвойваю Варшаву. Жыву ў студэнцкім доме на плошчы Нарутовіча, і адміністрацыя патрабуе лекарскае пасведчанне аб стане майго здароўя. PLMA (Pomoc Lekarska Młodzieży Akademickiej) на месцы, у правым крыле будынка. Гэтай дапамогі патрабую ўпершыню. Доктар, салідных гадоў дзядзька, бярэ мой білет і вачэй ад яго адарваць не можа. А, здаецца, нічога асаблівага там няма: нумар, прозвішча, вучэбная ўстанова, факультэт. Урэшце апраменьвае прыветным позіркам і мяне. Аглядае як музейную цікавінку. З такой жа пашанай абстуквае маё, выпашчанае на студэнцкім харчу тулава, далікатна мацае трубкай. Няўжо ён.... Во, зноў дзіўна ўзіраецца ў мае вочы. Як у цудатворную ікону... І ўсё ўсміхаецца нейкім патаемным думкам. Нават калі піша даведку, то рука дрыжыць. А ўручае паперку, быццам узнагароджваў высокім званнем.

Калі я, збянтэжаны, падзякаваў за прыём, ён азадачыў мяне новай загваздкай:

— Przepraszam za ciekawość, — азваўся, бы да важнай персоны, — czy nie jest pan kuzynem generała?

Ад нечаканасці я абалванеў. Пра што ён? Які генерал? У нашым родзе найвышэйшы чын вайсковы меў дзед: младший унтер-офицер лейб-гвардии его величества... А, відаць ён пра Валкавыцкага, што ўспамінала мама: прыязджаў у вайну рускі брат застаўлянскага аднафамільца, савецкі генерал. Ды ліха яго ведае, сваяк ён нам ці не? Я замяўся:

— Raczej nie, — прамямляў.

Пан доктар у захапленні:

— Rozumiem, rozumiem (чытай: малайчына, зух!), — канфідэнцыяльна моргае.

Я аднак нічога не зразумеў. Яшчэ не ведаў, што ў Андэрса служыў мой дубальтовы цёзка, генерал. І доктар меў на ўвазе яго.

Ну, вядома, у той час казыраць такім сваяцтвам мог толькі дурань.

### Дыпламат

Восень, 1949. Еду на вучобу ў СССР. Перад адпраўкай завялі мяне ў новы, першы пасля вайны, таварны дом і сказалі: будзеш там нашым „амбасадарам", а змахваеш на „монтэкасінца". Выбірай — на такую і такую суму — належнае місіі адзенне. Выбраў дэмісезоннае паліто, дэмакратычны касцюмчык, нямаркую куртку, такую ж кепку і крацісты шалік. Але забраў з сабою і „монтэкасініяну". Як нармальны мужчына, не люблю хадзіць у новым адзенні. Дык і на Цвярскім бульвары 25 „амбасадарнічаю" ў тым, да якога прывык. І мне здаецца, што нічым не выдзяляюся з маскоўскага вулічнага тлуму, ні выглядам, ні паводзінамі. Плыву рекой нарядной по широкой мостовой і толькі чую:

Эй, товарищ! Эй, прохожий!

С нами вместе песню пой!

Ажно ў майскую песню ўрываецца Валодзька Цендракоў:

— Ребята, на Тверской шпана лупит наших румынов!

Падзея побач. Тверская — вуліца Горкага. Пабеглі на выручку. Аказалася, бойка ўсчалася з-за масквічак, якім румыны прапанавалі dupu (дружбу). Былі навічкамі, не ведалі ні рускай мовы, ні правіл тутэйшага побыту. Але і балгарыну, чацвёртакурсніку, без дай рацыі дасталася па шапцы. А я, хоць бы што, хаджу па сэрцы ўсёй Расіі як уладар. Галю Ягораву праводзіў аж да вузкага праходу на Красную плошчу, да самага пад'езда ейнага дома. І ніхто мяне пальцам не крануў. А Галя — дзявоха ціптоп! Куды тым, „румынскім", да яе.

Тайну раскрыў у бани. Гэты храм культуры гнездзіўся ў задрыпаным завулку неўздалёк ад нашага інстытута. Па камфорту ён, вядома, не раўняўся з элітарнымі Сандунамі, але і ў ім можна аформіцца паводле патрэбы: выпарыцца, высцебацца бярозавым венікам, пагаліцца, падстрыгчыся, адпрасаваць адзенне, выпіць куфаль піва, кульнуць сто грамм. Вось і я перад парылкай абмаладжваюся ў цырульніка, а ён, як той варшаўскі доктар, завіхаецца каля мяне звыштарыфна, і шэпча на вуха:

— Знаю, кто вы. Вы с посольства...

І мінай дае зразумець: Полный молчок. Никто про это не узнает. Будь спок.

Во дзе мая сіла! У зелянковым шынельным сукне заакіянскага паходжання. Палеглы ў бітве з самураямі новазеландзец выручае саюзніка. Адданага займеў заступніка. Нават пасля смерці Сталіна, калі Варашылаў выпусціў крыміналістаў і яны запрудзілі Маскву, урки мяне не чапалі.

## Інжынер

Той жа час. Ахоўнае сукно, хоць і якаснае, сцерлася. Адзеўся я ў дэмакратычны касцюмчык. Электрычкай „Москва — Апрельевка” еду ў прыўзнятым настроі з заняткаў. На творчым семінары чытаў новыя вершы. Хвалілі. Вагон напаўпусты. Падмаскоўны народ яшчэ на „стройках” сталіцы. І я шкадую, што няма звычайнай як у канцы дня „толкучки”, калі працавікі ў прапацелых ватоўках вяртаюцца ў свае спальні. Хачу іх бадзёрыць творчым настроем. Але ў вагоне стракаты вонкава неакрэслены сацыяльны склад. Пляваць ён хацеў на твой душэўны ўздым. Дык накіроўваю ўвагу на мілавідную малодку, што сядзіць насупраць. Прыкмячаю, і яна коўзае дапытлівым позіркам па маёй фізіяноміі. Абмяняўшыся паглядамі, бяру ініцыятыву ў свае рукі:

— Девушка, куда едете?

— Во Внуково.

— О, стюардесса?

— Нет, не угадали.

— А кто?

— Учительница.

Чаго мне больш трэба? Во каго ўражу!

— Значит, мы соседи, — накіроўваю спадарожніцу на патрэбную выснову.

— ?

— Я живу в Переделкине, — паясняю. — Теперь ваш черёд; отгадайте, кто я? — пускаю ў вочы туман і ўжо чую: „Ах, я так и думала! Вы из городка писателей. Вы поэт!”

Девушка азмрочыла мяне. З адабральнай усмешкай сказала:

— Вы инженер.

Не, не інжынер чалавечых душ, а звычайны тэхнарук. Нічога ўва мне не знайшла паэтычнага. На гэтым можна было б і кончыць гутарку, але я па здрадлівай інерцыі гну ўздымную лінію:

— Вы здешняя?

— Нет, из Украины... Западной.

Хапаюся за саломінку:

— А как вы думаете, я — здешний?

— Вы из Прибалтики! — заліваецца ўцешным смехам украінка і я патанаю ў безнадзеі.

## Першая пальчатка Польшчы

Зноў усплывае Перадзелкіна. З другога курса жыў я ў загарадам інтэрнаце ў чатырохместным пакоі. Кампанію складалі аднакурснікі: асецінец Георгій Гагіеў і двое русакоў — калінінец Аляксандр Гевелінг і ленінградзец Барыс Нікольскі. Слаўныя хлопцы, добрыя таварышы, азартныя гульцы. Ноччу, адарваўшыся ад літаратуры, забівалі „трызубца”, часам і „казла”, а зімою прышпілялі да ног лыжы і імчаліся ў лес, на ўзгорысты бераг завілістай рэчкі, пад рэзідэнцыю праваслаўнага патрыярха ўсяе Русі, або ў бок Унукава, у чароўную бярозавую рошчу. А тут Кірыл Іванавіч (а мо Іван Кірылавіч?), наш сяброўскі фізрук, падкінуў нам дзве пары баксёрскіх пальчатак.

— Учитесь боксу, ребята, в жизни пригодится!

Мы гэта ведаем, адным талентам у літаратуру не праб'ешся. На трэніроўку! Перамагае той, хто найдаўжэй выстаіць на нагах. Не хапае сіл, лезь пад стол. А я ў жыцці не меў на руках скураных пальчатак. Без бою лезці пад стол? Палез бы, але як на тое, у Маскве чэмпіянат Еўропы па боксу, і палякі выйшлі на першае месца. Трэба трымаць марку, я ж іх „амбасадар”.

Сябры выскачылі са штаноў, скінулі кашулі. У адных трусах і майках размінаюцца. А я начапляю на тулава амартызатар — польскі кажух, які здабыў на канікулах, а на рукі — агромністыя скураныя куксы. І пускаю ў вір верхнія канечнасці. Ніколі не думаў, што так лоўка можна імі віраваць.

— Польская школа! — пасля мінутнай паказухі заявіў я з выклікам:

— Кто первый?

Ахвочых не аказалася. Пальчаткі так і не згулялі адведзенай ім ролі.

Ажно прыехалі завочнікі. Выбіраюцца ў Ясную Паляну. І мы з імі. Ходзім па музеі-сядзібе, усё цікаўнае. Тут Леў Мікалаевіч пісаў, там араў, купаўся, адпачываў, назіраў ваколле. Згадваем, у якіх творах адлюстраваў і намі бачанае. А да мяне прыліп мядзведзіна сібірскі, на крок не адступае. Ахоўніка прыставілі? Непрыемнае адчуванне. Урэшце, калі ён на хвіліну адвярнуўся, дзялюся з Гагіевым сваім „адкрыццём”:

— Чего этот тип возле меня ветрится?

А Жора смяецца:

— Это боксёр. И я сказал ему, что ты — первая перчатка Польши...

Жартаўнікам быў Жора. А я спазнаў смак баксёрскай славы. Ну і, выходзіць, фізрук меў рацыю.

## Правакатар

13 лістапада 1960 г. на бэгэкатоўскі трон узышла Лідзія Бялецкая. Панавала да 6 снежня 1962 г. Толькі два гады (патрэбныя да бяскрыўднай пенсіі), а ўелася ў памяць, быццам іншых уладароў мы і не мелі. Пасля аўтарытарнага рулявання Уладзіміра Станкевіча, прышэсце ягонай таваркі, якую, дарэчы, ён і ўзвёў на трон, вітаў я з надзеяй на передых у бязглуздым самаедстве, што ўзнікла на лініі БГКТ — „Ніва". Палымяная „Ліда", камсамольская Жанна д'Арк даваеннай вялікай Белыпчыны, у культуры ні бэ, ні мэ. Тым больш у беларускай. Будзем яе славіць, дарыць кветкі, і рабіць сваю справу. Ды роля англійскай каралевы ў новым грамадскім ладзе выдалася нашай валадарцы непрыстойнай. У ёй прачнулася прага барацьбы. І яна (валадарка), падмацаваная інструктажам пратэктара, які дзіўным збегам акалічнасцей сігануў — хворы! — у МУС (і трэба ж, якраз на нацменскую дзялянку), пачала руліць выпрабаваным у баях метадам. Мы яе славім, а яна нас гэтым метадам. Мы ёй кветкі, а яна іх пад палітычны кантаслуп.

Хай кідае, лаяць за гэта не будзем — славім далей. Апагей — навагодняя (1962) батлейка. Пачаткова зрабіў яе Віктар Рудчык. Мне яна не спадабалася: панурая, не на абранай лініі. Перарабіў яе, а фактычна зляпіў нанова — вясёлую, як наша Ліда. Аўтар ранейшы. І ганарар яму, каб не падумаў, што пагнаўся за трайнікамі. Толькі не ўлічыў зманлівых люстраў акаяннага кантаслуп. У ім, замест хваласпеву, Ліда ўбачыла рэвальвернае слова:

ПРАВАКАЦЫЯ

З такім прыгаворам і лягла батлейка на вырашальны стол І сакратара ВК ПАРП. Тав. Лашэвіч злёгку пажурыў мяне (за пустыя бутэлькі, раскінутыя пад тронам, вакол якога адбывалася вітанне новага года), а песня батлеечнай Ліды нават увяла яго ў стан душэўнага размагнічання.

— Ну, навошта вы яе так! — смяяўся:

Па садочку я хадзіла,<br>Яблыкі зрывала.

— Дык садочак — гэта БГКТ, а яблыкі — актывісты! — пераказваў каментар Ліды. — А рэдактар „Нівы”, як думаеце, хто? — аж слёзы выступілі ў вачах. — Яблыка гнілое!

Пасмяяліся. Падбадзёраны прыязным стаўленнем Інстанцыі, I красавіка інфармую чытачоў, што дырэктар „Бэтэскі” вырашыў успамагчы мастацкі рух на Беласточчыне трыма прэміямі і заграпічнымі стыпендыямі. Ускосна слаўлю шчодрасць валадаркі. На гэты раз маё шчыраванне трапіла ў МУС. I мне стала не да смеху. Прыгавор: рэдактар „Нівы” — злосны правакатар. У чарадзейным кантаслупе прыняў я выгляд Стральчука з кіпучай маладосці выкрывальніцы. Не знайшлі толькі Прытыцкага, хоць і ён зямляк.

## Памешчык

Не лезь у хамут, які не па табе. Так падказвае народная мудрасць. А мы гэту абузу ўсё выбіраем на выраст. А часам начэпяць яе на карак паняволі. I не муляе.

У шасцідзесятыя гады мінулага стагоддзя паміж беластоцкімі і гродзенскімі рэдакцыямі наладзіліся, як тады мовілася, цесныя вузы дружбы. Мы ездзілі да іх, яны да нас. Адны ў другіх пераймалі вопыт працы і гасцявання. Як правіла, ездзіла кіраўніцтва рэдакцый. А паколькі органаў друку і маўлення — у іх і ў нас — было малавата, на правах парытэту кантачылі „Беластоцкая газета” з „Гродзенскай праўдай” і беластоцкае радыё з гродзенскім радыёвяшчаннем. Мяне бралі на прычэпку: па той бок не было партнёра. Дык і не гублялі час на мантаванне складу „дружбакоў”. Ехалі на званок вядучага органа, якім у нас лічылася „Газета”.

Вось і едзем: Рысек Краська — сакратар „Газеты”, Лешак Кубіцкі — галоўны Беластоцкага радё, ну і я (прычэпка), такі ж чын з „Нівы”. Дарога кароткая, нават роляў не распісалі. А тут, толькі вызваліліся з сяброўскіх адбымкаў, як з'явіўся карэспандэнт БелТА:

— Хто кіраўнік дэлегацыі? — дапытваецца.

Мы пераглянуліся: кіраўнік? Не было ніякай гутаркі наконт кіраўніка кіраўнікоў. Па росту гэты хамут павінен несці Кубіцкі. Аднак наперад высоўваецца няраслы Краська. I мы, рэшта дэлегацыі, з палёгкай уздыхаем. Але і самазванец мала цешыўся гонарам. Сталічны прадстаўнік брацкай гільдыі, з мінай самазадаволенага докі (глядзіце, які я спраўны!), падсоўвае Краську да аўтарызацыі аркуш машынапісу:

— Падпішыце! — просіць загадным тонам.

Краська здрэйфіў. Што рабіць? — устраміў у мяне спалоханы позірк. Паказвае паперу. Чытаю: „Інтэрв'ю з кіраўніком польскай дэлегацыі...” (месца на прозвішча). А далей старонка энтузіязму. Наш кіраўнік захапляецца квітнеючым горадам, вясёлымі тварамі гараджан, натхнёнай працай будаўнікоў светлай будучыні. Увесь тэкст у стылю, ад якога мы ўжо адвыклі.

— Я ж яшчэ нічога не бачыў, — кажа азадачаны Краська.

— Падпісвай, — раю. — Потым пабачыш. (А цішком: — Не такая важная мы дэлегацыя, ніхто гэтага не апублікуе).

І Краська нехаця падпісвае. Ага, салодкая роля кіраўніка! Цяпер мазгуй і за нас.

Дайшлі да кульмінацыі. У Вярэйках у час узорнай сяброўскай бяседы ў дагледжаным саўгасе „Ваўкавыскі”, па неабачлівасці самазванца, стаў я спадчыннікам вялікай зямельнай маёмасці. Падарунак лёсу не толькі ўзнімаў маю грамадскую значнасць, але і ўсяляў надзею на бясхмарнае жыццё ў беластоцкай яве.

Пасля першага тосту, калі наш кіраўнік збіраўся ўзняць чарку ў гонар гаспадароў, увагу іх прыкавала не змесціва ў чарках, а маё „дзіўнае” прозвішча.

— Адкуль яно? — пытаюцца. — Вы — Валкавыскі, і наш саўгас „Ваўкавыскі”. Звычайнае супадзенне?

Краська, вядомы беластоцкі выскаляка, уносіць яснасць:

— Przecież on jest synem waszego pomieszczyka!

Адных развесяліў, другіх насцярожыў, але ўсе дружна выпілі за здароўе гаспадароў. Як ні дзіўна, быў тост і за панскага нашчадка. Мне роля спадабалася, і я, на пацеху абодвум бакам, згуляў яе без запінкі да апошняй дзеі. Пасля энтага тосту я пахваліў кіраўнікоў саўгаса за дбайныя адносіны да спадчынных уладанняў, пажадаў далейшай дбайнасці і паабяцаў, што калі маёнтак вернецца ў законныя (мае) рукі, дык ушаную іх пачэснымі пасадамі. Вядома, атрымаў належныя акцёру апладысменты і мы развіталіся ў жартаўлівым настроі. Малітоўную позу пры дурной гульні заняў толькі аграном. Ён, выбраўшы момант, шапнуў мне на вуха:

— Будьте спокойны, всё будет на должном уровне.

Гэта быў аптымістычны хэпі-энд.

## Багатыр

Сын польскага пана — нязбыўная мроя? Фантазіі ў ёй, што кот наплакаў. У маіх несвядомых фізіялагічных працэсах такія сны ніколі не віталі. Іншая справа — багатырскі сон. Тут я бываў і Мурамцам, і

Рыхардам Зорге. Хоць у яве далёкі ад гэтых герояў. Такім быў і ў час, калі жыў на ціхай беластоцкай вуліцы, якой прысвоілі таксама мірнае (праўда, з агаворкай) імя Гротгера. З агаворкай, бо пахла яно баталіямі. Але гэты пах ніколі не парушаў вакольнай ідыліі. Наш новы дом між старэйшых будынкаў нічым асаблівым не выдзяляўся. Хутка ўсе перазнаёміліся. Талакою ўпарадкоўвалі панадворак, а на змярканні, старыя і малыя, з узбуджанымі тварамі ўліпалі ў блакітныя акенцы: якраз у тэлевізіі ішоў упершыню серыял Stawka większa niż życie. Уся краіна сачыла, як польскі ас водзіць за нос прабеглага гестапаўца Брунэра. Неўзабаве Клёс вырас на самага вялікага польскага героя. І ў панадворкавай гамонцы гарэзных падшыванцаў лавіў я характэрнае выслоўе Клёса: Nie ze mną takie numery, Bruner! Я ўсміхаўся, прыкідваючыся, што нічога не бачу. І яны на мяне — нуль увагі. Вось ідзе сусед з працы — і ўсё.

Раптам хлопцы перамяніліся. На маё з'яўленне заміралі, аж станавілася няёмка ад бляску распаленых цікаўнасцю вачэй. Што сталася? Вера не ведае, цешча не чуе. Перапытваю дачурку — маўчыць. Урэшце прыходзіць з пакаяннем: у дзіцячай гульні „чый бацька значнейшы” (а мой — лекар, а мой — суддзя), збіла з панталыку сяброўак, выдаўшы сямейную тайну. Сказала, што сапраўдным Клёсам з'яўляюся я, яе бацька, а той, з серыяла — толькі акцёр, звычайны Мікульскі.

Нашай размовы нікому аднак не выявіла, бо малыя разведчыкі надалей праводзілі мяне зайздроснымі позіркамі. І не скажу, каб мне гэта роля не падабалася.

## Інжынер II

Бурапенны 1981. У разгары беластоцкага бушавання „салідарыстаў” іду правым бокам вуліцы Сянкевіча ўверх (чаго мяне трасца нясла туды?). Ажно з Рыжскай вывальваецца раз'юшаны бык у чалавечай постаці.

— У, вы — інжынеры! — бярэ мяне на абардаж і восьвось пачне малаціць сукастымі кухталямі.

Ухіляюся, скручваючы на Рыжскую. Далей „Ухвыты” — бастыён рэвалюцыі. Дык азвярэлы бамбіза адтуль! І я — інжынер! Зноў інжынер, як у падмаскоўнай электрычцы. Толькі абставіны дыяметральна процілеглыя. Згадаліся шасцідзесятыя гады, калі я, саракагадовы, апынуўся ў сабачай аблозе. Цісаулі з усіх бакоў і я, зацкаваны, не знайшоўшы разумнейшага выхаду, вырашыў здавацца. Чорт

вас бяры! І пагоншчыкаў, і рэдакцыю! Заўтра іду ва „Ухвыты", мо прымуць за слесара (мая першая прафесія)?

Адчайнага рашэння не падзяліла Вера.

— Ты толькі думаеш пра сябе, — сказала. — Падумай і пра сям'ю.

І я пачаў думаць. Кінуць „Ніву", не сказаўшы нават „да пабачэння" — проста. А што чакае цябе ў тых „Ухвытах"? Калі і прымуць, то не схаваешся ад тамашніх следапытаў. Усё вынюхаюць: і хто ты, і хто твае бацькі, і што рабіў, з кім гуляў. Засмяюць:

— Ślusarz habilitowany!

Добра, каб толькі так. Я ж дваццаць год напільніка ў руках не меў. Які з мяне слесар. Памочнік рабочага — усё, на што я здатны.

А пасля сустрэчы з быкападобным незнаёмцам перадумаў. Памочнік слесара ў сорак год — блазенская роля. Але адольная. Упартасці ў мяне хапае. Хто ведае, калі на маім лобе дагэтуль віднее надпіс „інжынер", мог бы выбіцца і ў інжынеры.

А ці было б лягчэй? Вось гэта пытанне.

## Педагог

Пачатак дзевятай дэкады. Беласток, скверык на „Пяста". Сяджу на лаўцы з думкамі ў былым. Падыходзіць незнаёмы дзядзька. З фальшывай усмешкай дае праз зубы металёвае dzieńdobry і, не просячы згоды, садавіцца побач.

— Już na zasłużonej emeryturce? — уключаецца ў мае панылыя думкі.

— My się znamy? — углядаюся ў яго.

— O, już i zaawansowana amnezja! — яхідна, са здзекам дапякае.

— O co chodzi? — насцярожваюся.

— Przypomnę, — з асалодай уводзіць мяне ў ачмурэнне. — Pan wylał mnie z pracy!

Яшчэ адзін пакрыўджаны, думаю з дакорам сумлення і ўдакладняю:

— Z jakiej pracy?

— Wciąż udajesz? — пераходзіць на „ты". — Pracowaliśmy razem.

— Gdzie? — варушу мазгамі.

— W szkole! — злосна вылупіўся.

Камень спаў з сэрца.

— I co ja tam robiłem? — душуся ад смеху.

Прыхадзень настабурчыўся, у вачах маланкі.

— Co robiłeś? Byłeś dyrektorem, głupku! — азарае маю чорную памяць агністым бляскам.

— Niech będzie, — палагоджваю атмасферу бяседы. — A za co straciłeś pracę? — цікаўлюся. — Pewnie za politykę?

— O, wraca pamięć! — дабрэе сусед. — Za politykę, dyrektorku, za politykę, — ляпае мяне па каленях.

— A konkretnie? —дабіваюся.

„Палітык” патэтычна чытае:

Nasza partia wszystko zrobi,
Żeby Polak żył jak Tobi!

— Co cito przypomina? — унушальна зандзіруе.

— Krążyło takie coś za Gierka, — усё не магу даўмецца.

— Takie coś? — перадражняе і тлумачыць: — Za takie coś wręczyłeś mi wilczy bilet! To był mój utwór...

— Nie wiedziałem, że mam w szkole zdolnego poetę, — вінавачуся. — Sądziłem, że tylko upowszechniasz zakazaną twórczość.

— Dużo czego nie wiedziałeś, — згаджаецца падпольны аўтар. — Ale wkrótce się dowiesz.

— A mianowicie? — цягну за язык.

— Jestem prezesem Stowarzyszenia Pokrzywdzonych przez Nomenklaturę. Jasne? — дае зрузумець, чым гэта пахне.

— Jasne! — здаюся, і, каб адчапіцца ад назолы, каюся:

— Żałuję...

— No! — pokrzywdzony з задавальненнем фіксуе сваю перавагу, устае і, смачна плюнуўшы, кіруе на Баяры.

Значыць, „быў” я і адыёзным педагогам. Кім я толькі не быў!

# Мройнае віраванне Сідара Макацёра

## Год апалоніка

1998 год сустрэлі макатранцы з дваістымі пачуццямі. Дваістасць выклікалі дзве парныя дзевяткі, што натапырыліся ў цэнтры новага летазлічэння.

— Цыклопы! — жахнуўся Стахранюк. — Павіслі над намі цыклопы! Гаварыў жа ў Ратным Гара-Гарышчэўскі: „Няважна — будзем беднымі ці багатымі, важна каб былі круглавокімі”. Значыць, здзейсніцца...

Змрочную здань, што залунала над энклавам спрабаваў развеяць Паўхранюк. Даследаваўшы дакладна цыклопападобныя знакі ў выяве прышэльца, ён сказаў:

— Калі гэта і цыклопы, дык не тыя пачвары з мінулай эпохі. Хутчэй за ўсё яны з падатраду беспазваночных. Маюць адно няпарнае лабавое вока. Жывуць у вадзе. Хоць і драпежнікі, нам шкоды не зробяць.

Але страх, пасеяны Стахранюком не адступаў ад макатранцаў. Асабліва пасля таго, як Хранюк простым матэматычным дзеяннем спалучыў вядучую адзінку з замыкаючай васьмёркай. Атрымалася трывожнае

999

Цыклопы злучаюцца. Хана! Толькі Хрэн, ветэран нязбыўнай мары, не панікаваў. Ён намагаўся ўнікнуць у сэнс загадкавых знакаў. Урэшце расслабіўся, крэкнуў і метадам Хранюка вывеў гістарычнае ўраўненне:

1998 = 1188 = 99 = 18 = 9

Пачвары выразна адступілі, рассеяліся. Мала таго, у хвастатай дзевятцы Хрэн убачыў тыповага жыхара неглыбокіх вадаёмаў, лічынку сажалкавай жабы — апалоніка.

І, асепленыя нечаканым адкрыццём, насельнікі энклава паверылі ў трываласць Макатры, і 1998 год аб'явілі годам апалоніка.

## О часы, о норавы!

Пасля сумнаслыннага выступлення ганаровага старшыні сябравіцкай управы, калі ён, незадаволены адведзенай яму роляй, абвінаваціў самаадданых упраўленцаў у грэхападзенні (дзеляць маёмасць без яго), зрокся гонару і ўзначаліў міколасяргееву фронду, управа

закіпела справядлівым гневам. І ты, Брут! Усё табе мала?! Хочаш усю ўладу пераняць у свае заграбушчыя лапы!

І сябравіты ўспомнілі гнуснага рымскага змоўніка Катыліну, які ў карыслівых мэтах строіў падкопы пад фундамент рымскага ладу, і згодным хорам грымнулі:

— Лапы прэч ад управы!

Тут і выступіў Цыцэранюк. Прыгадаўшы карані, ён пакарыстаўся тэкстам славутага консула, што выратаваў рымскую рэспубліку ад Катыліны. З крыніцы тэарэтыка філасофскай рыторыкі выкінуў толькі прозвішча старажытнага пярэкрута, падмяніўшы яго мянушкай нашага адступніка. А каб было больш пераканаўча, і пачаў сваю арацыю крылатым словам продка:

— Quousque tandem abutere, Barsina, patientia nostra?

І пераклаў: Калі ж, урэшце, перастанеш ты, Барсіна, злоўжываць нашай цярплівасцю?!

Далей вёў наступ на мове матчынай.

— Да якой пары ты, ачмураны фурыяй, будзеш здзекавацца з нас?! Дзе мяжа неўтаймаванай дзёрзкасці тваіх выступленняў? — заганяў у кут злоснага паклёпніка, падмацоўваючы латынь сакавітым сябравіцкім матам.

— Cui bono? Cui prodest? — закончыў фундаментальным пытаннем сваю прамову супраць Бараны Цыцэранюк. І сябравіты паўтарылі ягонае пытанне:

— Каму выгадна? Хто на гэтым выйграе?

Не выпадкова сябравіты ўспомнілі Катыліну. Быў ён адыёзным стрыжнем у працэсе распаду, што ў той час тачыў рымскую рэспубліку. Падобнае становішча склалася і ў нашым энклаве. Дык і палымянае слова Цыцэранюка згуляла роўную Цыцэрону ролю. Сябравіцкае consultum ultimum прызначыла змоўнікаў на забыццё.

Ці Цыцэранюк таксама давядзе сябравітаў да згоды і выратуе энклаў ад загубы? А мо пачалася ўжо bellum omnium contra omnes? Вайна ўсіх супраць усіх?

O tempora, o mores!

## 13 смярцей
### *(магільны сцэнарый знойдзены ў Харошчы)*

Кожны хоча памерці незвычайна:

1. Польскі палітык — калі не ў Чанстахове (урачыста), дык на TV (трыумфальна).

2. Ксёндз — у Ватыкане. Папам.

3. Рабочы — на галадоўцы. Гегемонам.

4. Падначалены — пасля шэфа. З вужом за пазухай.

5. Пан Твардоўскі — на Месяцы. У самоце.

6. Беларускі паэт — калі не на Парнасе, то прынамсі на прыдарожным узгорку. Абавязкова з рукамі раскінутымі ўшыркі.

7. Зянон Пазьняк — у Нью-Йорку. Калі дазволяць — на сесіі ААН. Дэманстратыўна.

8. Яўген Міранoвіч — у барацьбе з Лукашэнкам. Гераічна.

9. Сакрат Яновіч — на рыбалцы. З Валэнсам. Ты рыбак і я рыбак.

10. Цыган — на вісельні. З кампаніяй.

11. Моніка Левінскі — на чэлясе Клінтана.

12. Ельцын — у Крамлі. Царом.

Адзін селянін прагне памерці ў роднай хаце. Ніхто не жадае адысці ў лепшы свет невядомым салдатам.

### Неспазнаныя шляхі твае...

Было ў IV ст. да н.э. Піліп, цар Македоніі, запрасіў у сталіцу Пелу Арыстоцеля.

— Вучы майго ёлупа,— кажа, прадстаўляючы мысляру шалапутнага сына.

Пасяліўся мысляр у царскім хароме і ўбівае ў дубіну высокія матэрыі. А царэвічу ў галаве адно гулькі. Тым часам цар драхлее: абрыдлі яму і заваёвы, і ложкавыя ўцехі. Хто прадоўжыць вялікія справы?

І прыходзіць у думаўку мудрага „Стагірыта” смелая ідэя. Ідзе ў спачывальню царыцы, гіпнатызуе ўладарку, унушаючы:

— Саня не ад Піліпа. Саня ад Зеўса!

Прачнуўшыся, царыца кліча сына і выяўляе тайну:

— Сынок, ты не ад нямоглага бацькі. Я ўбакавілася і пачала цябе з царом багоў.

І падзеі разгарнуліся ў патрэбным напрамку. Саня адчуў у сэрцы слодыч неўміручасці, а ў руках — ваяцкі сверб. Стаў Лясандрам. Расправіўся з прэтэндэнтамі на трон і антымакедонцамі. Заваяваўшы ўладу над дзяржавамі Грэцыі, пайшоў на Усход, здабываць рэшту свету.

Чым гэты ўсходні „дранг” кончыўся, добра ведаецe.

Прайшло 2255 год (!). Бяздарнаму капралу прысніўся сон: спускаецца з неба Бог і шэпча яму на вуха:

— Адолька, ты — мая прычындала вогненная! Ich liehe dich!..

Прачнуўшыся, капрал абнародаваў сон і стаў фюрэрам III рэйха. Далей — як у старой эры. А ў міжчассі колькі такіх цароў і капралаў насіла наша зямля. І ўсе ганарыстыя карлікі з прыроднымі тромбамі ў мазгах, ашалелыя праводцы — з дзікім полымем у вачах, з каршуновымі кіпцюрамі. І ўсе параноідныя псіхапаты — „уладкоўвалі" свет у імя ілжывай місіі.

Слабая ўцеха, што канчалі аднолькава — гэты гатунак гомасапуна размнажаецца самагіпнозам.

**Жахлівая папка**

XX стагоддзе з часам назавуць векам дэманаў. А пакуль міласэрныя лёсам робяць падлікі страт. Так маецца справа і ў Беларусі. Як паведамляе „ЛІМ", вядзецца праца над энцыклапедыяй рэпрэсіраваных пісьменнікаў. У 30-я гады „кіпцюры ГПУ" дацягнуліся амаль да кожнага з больш чым двухсот беларускіх пісьменнікаў. Трагічная гісторыя „першага прызыву" (1917-1937 гг.). Параноя сталіншчыны выбухнула напярэдадні 20-годдзя кастрычніцкага перавароту. Падонкі рэвалюцыі прыступілі да татальнага знішчэння яе найадданых дзяцей. І ў гэтае прадонне трапіла творчая эліта. Захаваліся толькі „класікі".

Сталін у стадыі параноіднага шаленства бачыў адно ворагаў. Дык праз гэты кантаслуп глядзелі і ягоныя апрычнікі: „ворагаў" у душагубку даставяць па канвееры — колькі душа каўказская пажадае. Любы кантынгент выканаюць з гонарам.

Як з жахлівых сноў вынырнула „Папка Бермана". Вось зернятка плёну сталінскага наркома:

„Я. Купала является активным лидером нацфашизма". „В 1928 г. Купала, как активный нацдем, являлся председателем Комитета защиты Белгромады в связи с провакационным процессом ее в Польше. По инициативе Купалы был организован сбор средств в помощь арестованным послам Белгромады в Польше, для чего был проведен литературно-художественный вечер в Минске, который дал 1200 руб., а в последствии активно помогал переброске послов Белорусской громады из Польши в БССР для активизации и усиления нацфашистской работы".

Вось ён, беларускі лёс: у Варшаве ты агент Масквы, у Маскве — польскі фашыст. І яшчэ ягадка з той папкі:

„Якуб Колас, старый и хитрый враг Советской власти и Коммунистической партии". „Осуществлял руководство вредительско-шпионской работой Академии наук БССР", „высланному активному

нацфашисту ЭпимахШипилло Колас в сентябре 1931 года выслал деньги”.

І з нашага непасрэднага лёсу: асудзілі тады 97 палітэмігрантаў, якія прыехалі ў рэспубліку з Заходняй Беларусі (1933-1934 гг.).

*(З кнігі Расціслава Платонава „Лёт”, Мінск, 1998, 100 экземпляраў).*

У гэтай параноі здзіўляючая жывучасць: пачалася за цара, калі беларускасць лічылася інтрыгай палякаў (і наадварот). Прыйшоў 1956 год — і вар'яцтва адрадзілася. Тут ахрысцілі нас „маскоўскім насеннем”, там — „буржуазнымі нацыяналістамі”.

А ці кантаслуп кануў у Лету?

## Чыім вучнем быў Сталін

БСЭ называе Сталіна актыўным змагаром за ажыццяўленне ленінскіх запаветаў (1974) . І раптам — тыран! Хлусіць БСЭ. Грубы каўказец вучыўся ў іншага настаўніка — таго, што вывеў у вялікія сыны шалапутнага македонца. Сталін ажыццяўляў запаветы Арыстоцеля.

Якімі ж зёлкамі напаіў славуты грэк памежнага горца? Тымі ж, што і Аляксандра Вялікага. Вось тыя зёлкі:

„Тыран павінен знішчыць выдатных людзей у краіне, таму што яны могуць стаць небяспечнымі. Ён павінен закрыць усе клубы і асцерагацца ўсяго, што здольна абудзіць мужнасць сярод яго падданых. Ён не можа дапусціць існавання аб'яднанняў, у якіх абмяркоўваюцца складаныя пытанні. Тыран павінен сачыць за тым, каб яго падданыя як мага менш сустракаліся адзін з адным, ён павінен вынішчаць дружбу між імі і мець скрозь шпіёнаў, якія павінны не толькі падслухоўваць, пра што падданыя гавораць, але і сачыць, каб тыя не выказвалі сваіх поглядаў і наогул іх не мелі”.

Цяпер вам ясна, хто выспеліў Сталіна? Чаму ж тады гісторыкі ўтойваюць кніжную ісціну? Арыстоцеля не чыталі? Дапускаю такую магчымасць. Дык на гэтым палетку сярэднявечча, удзельныя княствы, свае настаўнікі і тыраны. Латышонак тыраніць разбойных балахоўцаў, Туронак — сябрукоў Вільгельма Кубэ, Мірановіч — камунякаў („нашых хлопцаў”), Глагоўская — патрыётаў. У кожнага свая дзялка, свае градкі. Неахопнае не ахопіш. Праўда, імкнецца гэта здзейсніць Яновіч, але ён яшчэ да Арыстоцеля не дабраўся.

А тут і агульная хвароба — гісторыкі паказваюць не рэальныя з'явы, а ілюзорныя. Кожны перарабляе падзеі на свой капыл. Усё, каб аплесці нас сваім ачмурэннем.

Узбаламучаны век. Сталін, каб яму серай адрыгнулася, тварыў пекла, а мы думалі — будуе рай на зямлі. Цяпер, грэючы ў пекле азяблыя косці, смяецца з нас, задаволены.

Сядзіць Сталін у сагане,
Падспеўвае сатане:
— Я тыран і ты тыран,
Садавіся ў саган.

## Як расплаўлялася сталь

Было ў 1953 годзе. У вітальні апраметнай з'явіўся лупаты тып у зношаным паўформенным фрэнчы пад таварыша Сталіна.

— Мне да шэфа! — прафесійна гыркнуў, уставіўшы алавяныя вочы ў жалезныя дзверы.

— У якой справе? — спытала стража.

— Па энкавэдэшнай лініі.

Стража, апазнаўшы прыхадня, расступілася:

— У добры час!

Бразнула ў дзвярах клямка. Шусь! — і няма лупатай з'явы. А праз хвіліну за жалезнымі дзвярыма грымнула. Адчынілася вентыляцыйнае акно і пачуўся службовы голас качагара з абслугі рускага катла:

Уберите трусливого Берию! Наделал в штаны, котел загадит. Не достоин топки дохлых особого склада. Отправить в зону бесхребетной нечисти.

Адчыніліся важкія дзверы. Чэлядзь, са скрыўленымі ад агіды тварамі, вынесла запэцканага ўласнымі адходамі Берыю. Пад'ехала чорная душагубка.

— Улазь, лупатая амёба!

— Ах, каб гэта чуў Коба! — Берыя азірнуўся назад, але Кобы няма. І сеў у чортаў тарантас.

Коба ўсё чуў, толькі саромеўся свайго размагнічанага падручнага. Плюнуў з пагардай і пайшоў чысціць кацёл Мікіту Сяргеевічу. А поруч плыла кандальная песня рускіх качагараў:

Вазіў зэкаў Берыя
У сваю імперыю.
У новай імперыі
Зэкі возяць Берыю.

## Пярэкрут у пекле

— Я да вас, спадар Вельзевул, як да апошняй інстанцыі, — корчыцца перад лысым чортам пярэкрут. — Верай і праўдай служыў на карысць нашай справы, а стаю ў чарзе бязродных касмапалітаў. Гэта мне зусім не падабаецца. Хачу стаяць між лепшымі з лепшых.

— Не ў маёй кампетэнцыі, таварыш сакратар, — суха адказаў лысы чорт і натапырыў увысь крутыя рогі. — Сігай у смалу! — гаркнуў. — Чарцей не выбіраюць.

Пярэкрут на хвіліну слупянее, потым, успомніўшы рымлян, стукае абцас аб абцас і аддае чэсць лысаму:

— Ідучыя на смерць вітаюць цябе!

Рагач не ведае рымскага блазнавання, грукае касматым капытам аб брукаванку, высланую добрымі намерамі.

— Сігай! — таропіць.

— Рад старацца! — вярнуўся ў сваю стыхію пярэкрут і палез у саган. Яму запляскала чортава чэлядзь. Вельзевул прылізаў запэцканымі лапішчамі пучок шчэцця на лысай галаве і вылупіў здзіўлена бельмы: пярэкруту і пекла — руская баня.

— Падкіньце жару! — просіць той. Раздаюцца бурлівыя апладысменты. Пярэкрут вынырвае з ліпкага смалянога варыва і заліваецца задорлівым рогатам:

— Служу Са...Са...Сатане!

— Ты — мне?.. Ты — мне? — здзіўляецца ў бяздонным цемрыве рэха.

Не выключана, што пярэкрут трапіў у пекла ў выніку заганнай фільтрацыі.

## Пад уладай дылетантаў

Да рэвалюцыі ў Расіі было каля аднаго мільёна паразітаў: капіталістаў, банкіраў, памешчыкаў, генералаў і буйных чыноўнікаў. На зары гарбачоўскай перабудовы каманда паразітаў налічвала 30 мільёнаў асобна ўзятых тузоў. Гэту каманду і ўключыў Міхаіл Сяргеевіч у свой „працэс”. І працэс пайшоў.

— Горбі! Горбі! — апладзіраваў яму свет. — Так трымаць!

Гарбачову не здзіўляюся — дылетант. Але каб свет захапляўся дылетантам? Адзін Рэйган кепікі строіў:

— Майкл! Скажи, пожалюста почему ты вибраль такой дольгий путь в Ойропу? Не лютше коротше и бистро?

— Чего же медлишь, выкладывай, говори — как? — гарачыцца Гарбачоў. — Давай план — и я немедля пущу процессе нужное русло!

Рэйган змоўк. Сам быў дылетантам. Дыспут вопытных дылетантаў падслухаў пачынаючы дылетант Ельцын.

— Маніць артыст згарэлага тэатра, — намякаючы на мінулае амерыканскага прэзідэнта, падумаў Барыс Мікалаевіч, — і, выбраўшы крутыя сцежкі, павёў Расію ў Нікуды.

**Адхіленне глуздоў**

Даказана: малое пачатковае адхіленне ў глуздах гомасапіенса вядзе ў непрадбачанае. Ад малога Уладзімір Рэзун прагнуў паўтарыць подзвіг Зорге. Таму і пайшоў у Акадэмію Тайнай Службы. Але ідэю планетнай рэвалюцыі схавалі ў сейф, Масква мірным шляхам стала сталіцай свету, героя рыхтавалі да любоўных заваёваў. Дыплом АТС адчыніў яму дзверу ў ГРУ, паслалі ў гарачую кропку кантынентальнага тэатра кахання.

Здабывай сэрцы Еўропы!

А выйшла наадварот: Еўропа падбіла заваёўніка.

— За сваю няўдачу землякам аддзячу! — сказаў Рэзун і пачаў пісаць даносы на сваіх. Еўропа запляскала. Брава, Woloda\

Муляла імя, дадзенае бацькамі ў гонар Ільіча, прозвішча па іншай прычыне націрала мазалі на глуздах. Назавуся Віктарам (Пераможцам) Суворавым! — прыйшло азарэнне.

— Very good! — адобрылі еўрапейкі. — I love you, Victor!

— Rezun kaputt! — раўнулі еўрапейцы. — Heil Suvoroff!

І паплылі ў свет выкрывальныя творы Суворава. Свет

аб'явіў аўтара геніяльным пісьменнікам. А яму ўсё мала. Вырашыў пранікнуць у муміфікаваныя глузды Сталіна. З засушаных звілін выдабыў супертайную задуму правадыра. Так нарадзіўся Дзень „М”.

Калі за гэты подзвіг Сувораў не стаў нобелеўскім лаўрэатам, значыць, шведы непрыхільна паставіліся да шэдэўра. Або не паверылі пярэкруту. А я на нейкі момант увайшоў у другое жыццё. „М” — гэта ж пачатак канца Еўропы! На жаль, не дачакаліся мы гэтага дня. Чырвоная Армія, ачышчаючы будучы тэатр вайны, выразала на глыбіню 100 км ад граніцы мясцовае насельніцтва. Пагалоўна. Ад нашай крыві пачырванела Падляшша і Панямонне, Буг адслонены. Ніякіх умацаванняў. Знялі нават пагранічнікаў. Азіяцкая арда нацэлена на Еўропу. Спружынілася ў чаканні дня „М” (5 ліпеня 1941 г.).

— Хто ж мы такія? — пачулася ніўскае пытанне. — І ў другім пераўвасабленні тутэйшыя? А ўсё-такі цікава, каго 22 чэрвеня вызваляў Гітлер?

— Каб розумам абхапіць неабхопнае, трэба дарасці да генія, — параіць Куптэль.

Будзем старацца. Толькі глузды вярэдзіць паскудная думка: ці гэты Рэзун не з беларусаў? На такую выснову штурхае прозвішча і від геніяльнасці. Толькі мы здольны так паганіць сваё, сваіх і сябе. Тут мы геніяльныя ад роду, ад пачатку адхілены ў непрадбачанае.

## Цыклафрэнія

Цыклафрэнія (маніякальна-дэпрэсіўны псіхоз) сярод высокаарганізаваных млекакормячых — пашыраная хвароба. Асабліва ўпадабала яна творцаў. Як даказвае навука, мастацкі атрад прыматаў ад 10 да 30 разоў часцей, чым іншыя гомасапуны, з'яўляецца яе носьбітам. А сярод абранцаў рэй водзяць акцёры (17 працэнтаў) і паэты (13 працэнтаў).

Цыклафрэнікі бавяць час між узлётамі і ўпадкамі. У залежнасці ад „фазы” бурляць кіпучай энергіяй або патанаюць у безнадзейнай роспачы. Між крайнасцямі захоўваюцца зусім нармальна. У стане ўзлёту мастак, перапоўнены бязмежнай верай ва ўласныя сілы, ломіць бар'еры мастацтва і прарываецца ў невядомую прастору. І ў мазгах творцы ўзнікаюць нечаканыя асацыяцыі — звычайнае пераўтвараецца ў нязвыклае. Скажаце: і добра, гэта і з'яўляецца эсенцыяй мастацтва.

Добра, калі мастак застаецца мастаком. А калі ён стане прэзідэнтам, як акцёр Рэйган? Тады мірнае зорнае неба можа пераўтварыцца ў зорную вайну. Вось дзе наша самая вялікая немач: палітыкі не нараджаюцца палітыкамі, яны імі становяцца. Сёння ён асенізатар, а заўтра — фюрэр, як жывапісец Гітлер ці паэт Пол Пот. І замест прыбіраць гарадскі клазет, пачне чысціць краіну, а то і свет. Між „фазамі” ён нармальны. Часам нават дзіця пагладзіць па галоўцы, усміхнецца да нас пластмасавай усмешкай. Гарантыі на аздараўленне аднак не дае.

Уся надзея ў кучаравай „Дольцы”.

## Чалавек-зло

Было на Блізкім Усходзе. У III ст. нарадзіўся аўтар Кнігі гігантаў, напаўлегендарны Мані. Заснаваў ён вучэнне аб першапачатковасці і

неадольнасці зла. Зло незалежнае ад дабра. І роўнае яму, як па ўзросце, так і па сіле. Гісторыя — барацьба святла і цемры, дабра і зла, Бога і чорта. Чалавек дваісты: створаны пеклам, але ў сааўтарстве з небам. Адсюль — усё зло ад чалавека. Чалавек — зло. Вучэнне жывучае. Пашырылася і апанавала блакітную планету. Мы ў аблозе маніхеяў. Будзьма чуйнымі!

Калі вы прачытаеце, што ў Беларусі ўсё зло ад Лукашэнкі, ведайце — напісаў гэта запраграмаваны пад „Рацыю" маніхей. Лукашэнка — чалавек. Лукашэнка — зло. Калі святар корань зла шукае ў іншаверцу, ведайце — прапаведуе блаславёны маніхей. Іншаверац — чалавек. Іншаверац — зло. Калі ўбачыце ў тэлевізары палітыка, які з іскрамі ў вачах звальвае свае грахі на плечы працоўніка, ведайце — гэта ідэйны маніхей. Працоўнік — чалавек. Працоўнік — зло. Калі ж пачуеце, што я стаў асатанелым ворагам Барскага, ведайце — вестку пусціў жалю варты маніхей.

## З Новага Свету

*(прэс-агляд)*

На кангрэсе Амерыканскай Асацыяцыі Славянаведаў (AAASS), які прайшоў у Бока Ратон, Фларыда, было ўсяго 1300 удзельнікаў. Значнай перашкодай правядзення кангрэса стаўся ўраган „Жорж", дзеля якога шмат хто не здолеў прыехаць на кангрэс.

Славянам усюды вецер у вочы. Аднак наймацней дзьме беларусам. У беларускай сесіі ўзяло ўдзел (толькі — аж?) 16 асобаў.

* * *

Наш разумны беларускі народ перастаў думаць. (Настальгічна-аптымістычная выснова Івонкі Сурвілы, старшыні Рады БНР).

Значыць, разумнік дацяміў — Амерыка за яго думае!

А мы людэ тэмны, нам трэба грошы тай хорчы хорошы. Ну і шчодры манарх прыдаўся б.

* * *

Шукаю нашчадкаў княскіх дынастый, якія б маглі прэтэндаваць на вялікакняскі пасад. Мы маем звесткі, што князі Радзівілы жывуць у Амерыцы.

Алесь Чорны.

Сябра маладзёвай нацыянал-патрыятычнай манархічнай арганізацыі „Ліцвіны", Гомель.

Дык хто сказаў, што народ не думае? Прыязджай, браток, да нас, у суседнюю манархію. На такі пост у нас прэтэндэнтаў процьма. Куды Радзівілавым нацыяналпярэкрутам да іх.

І піць будзем!
І гуляць будзем!
Нацыянал-патрыётак
Цалаваць будзем!

## Комплекс лідэраў

Лідэр — вядучы. Спасцігшы хітрасць слова, лідэр ператвараецца з павадыра ў пастыра, затым у правіцца, правадыра, увасабленне партыі, нацыі. Спынімся на першай ступені таінства — павадырстве. Павадыр — той, хто водзіць каго-небудзь, паказвае дарогу. З'яўляецца ім, для прыкладу, вядучы белвытоцкага тэлецэнтра. Яму здаецца, што калі ён прывёў у студыю разгубленага барана, дык без ягонай дапамогі кучаравы сваяк згубіць арыентацыю і, замест да пустарогага сямейства, будзе бэкаць да ваўкоў. Таму ён, хоць у матэрыі ні бэ ні мэ, сцябае чэмпіёна жвачкі павадырскім словам, пакуль той не завые па-воўчы.

Гэта яшчэ паўбяды. Бяда пачынаецца, калі на арэну павадырства выходзіць палітык. Яскравым прыкладам Хрушчоў. Куды ён толькі ні ўсоўваў сваю бульбяную нюхаўку. У Запаляр'і сеяў кукурузу, вучоных пасылаў на курсы да кузькінай маці, паэтам раіў пісаць вершы пад Дзямяна Беднага, з музыкі вымятаў какафонію, кампазітарам загадваў смажыць кукурузныя частушкі, у ААН уводзіў чаравічны бон тон.

Ну, але гэта быў найвялікшы расійскі прыдурак. А на Русі прыдуркаў заўсёды шанавалі. А як павадырыў Горбі, найсвятлейшы крамлёўскі цар? Тыя ж мужыцкія манеры. Запамяталася ягонае павадырства на сесіі Вярхоўнага Савета. Дзейнічаў бы памянёны тэлевядучы. Як толькі Сахараў увайшоў на трыбуну, перапыняў вучонага, збіваў з панталыку, іранізаваў, прыніжаў, аж той зніякавеў. Гэты момант вялікім планам пусціла тэлебачанне. І гэта быў апошні жывы партрэт сумлення нацыі.

А як у нас? Тут кожны павадыр. Пасадзіце ў тэлек Мар-дэ-Янку, Калінку і Млынара. Адзін другога не дапусціць да слова. Кожны будзе цягнуць адначасова сваю песню і мы з гэтага тэрцэту толку не вулузаем.

Комплекс лідэраў — пакута ад няздзейсненага. Гэта вялікая бяда.

## Ці хочуць пацукі вайны?

Паркінсан даказаў: кабінетныя пацукі размнажаюцца самазараджэннем. Цурком выкідае іх чорная адтуліна неарганічнай матэрыі. Упадуць на чатыры лапкі і тут жа нараджаюць сабе падобных.

— Як мой урад! — жахнуўся наш прэм'ер, зглыбіўшы тэорыю вучонага і даў указанні шэфу кабінета рыхтавацца да вайны з пародзістымі пацукамі. Мэта — кастрацыя мышападобных. Тактыка — маланкавае скарачэнне юрлівых хвастоў.

— Першы агонь выклікаю на сябе! — заявіў драматычна.

Даручана — выконвай. Шэфкаб склаў план бою ў канцылярыі гаспадара (644 пацукі!). З міністэрскіх чыноў стварыў корпус хуткага рэагавання АББ (адбюракрацім бюракратаў бюракратамі) і запрасіў штаб корпуса на рэпетыцыю.

Уключылі запраграмаваныя камп'ютэры, сыплюцца адсечаныя хвасты і тут жа сігаюць на новых уласнікаў. Пайшлі мутанты з двума, а то і трыма хвастамі, залежна ад рангу носьбітаў азадкавых канечнасцей. Штабісты напружылі мазгавыя звіліны, загадалі камп'ютэру правесці матэматычную аперацыю аналізу і сінтэзу — выскачыў шыфр:

644 + 26 = EUROPA

Клічуць дэшыфранта. Той тлумачыць:

— Каб канцылярыя прэм'ера працавала па-еўрапейску, патрабуецца 26 новых пацукоў.

— Капцы нам! — з горыччу канстатуе міністр унутраных спраў. — Тэрмапілы! Гаспадар хоча падпісаць мір I красавіка 1999 года, да ўступлення ў NATO.

— Толькі без панікі! — супакойвае генерал Глудзь, адказны за сувязь з часапрасторай. — Сёння кантачыў з вялікімі стратэгамі. Цікава адрэагаваў Мао. Высылае факс Бузку: „Не пераймай мяне. Мая вайна з вераб'ямі пацярпела фіяска — насякомыя з'елі ўраджай. Глядзі, каб цябе не з'елі пацукі”,

— Вось дылема! — цяжка ўздыхнуў шэф кабінета.

— Пацукі — не вераб'і, — рэзюміраваў міністр абароны.

Канчатковае рашэнне прыме „Дучэ”, які загарае ў Аўстраліі.

## аНАТАцыя

Урэшце нашы павадыры без нашай волі ўвялі нас у НАТА. Кажуць, дэмакратычна, ажыццяўляючы адвечныя памкненні продкаў.

— Мы ўжо ў свабодным доме! — уздыхнуў з палёгкай вызваленага ГУЛАГаўца Юрась Бузук.

— Аб чым ён? — навастрыў вушы Вялікі Электрык. — Дык у чыім доме жылі мы дзесяць год, калі я вывеў вас з Пакутнай зямлі? — лыпаў няўцямнымі вачыма.

— У сваім,— патлумачыў адсталаму электрыфікатару мудры Санюта Квас. — Але вісеў над намі меч Лукашэнкі.

— Цяпер дамо прыкурыць калгаснай гнідзе! —дзвынкнуў бліскучымі шпорамі апрануты пад улана міністр абароны.

— Цяпер — мы! — падтрымаў міністра дучэ.

— На Лукашэнку! — вытыркнуўся як Пiлiп з канапель pan Zenon, экзыльны антылукашэнка.

— На гніду! — падхапіў кінутае фанабэрыстым уланам слова pan Stanisław, антылукашэнка падпольны.

Ваяўнічых руплівцаў астудзіў разважлівы міністр замежных інтарэсаў. Узняўшы ў блакітную столь прафесарскую бародку, ён глыбокапаважна спытаўся:

— Панове браты, а што на гэта скажа Вялікі Брат? Дык за ім вырашальнае слова.

Прысаромленыя госці, праклінаючы ў душы Сексаголіка, апусцілі насы і ў журботным настроі пакінулі ўрачыстую сустрэчу. Нашым павадырам свята не сапсавалі. Юрась Бузук і Санюта Квас, абняўшыся, віравалі ў эйфарыйным танц-парадзе і з вышыні свайго рангу ўперамешку ўзбуджана вяшчалі:

— Я!

— Я!

— Гэта ўсё я!

— Я!

— Мне дзякуй, народзе!

— Мне!

У сваю чаргу натаапрануты ўлан апантана малоў пра нейкую „першую лінію”.

— Я цяпер на першай лініі! — захліпаўся ад шчасця. — Я — першалінеец! — выпучваў грудзі.

— Усе за аднаго, адзін за ўсіх! — храбрыўся.

— Я гатоў! — кляўся.

— Wolnoć Tomku w swoim domku! — падагуліў узнёслую ўрачыстасць Вялікі Электрык, забыўшыся на падзею, дзеля якой зышлася павадырская эліта. А мо ляпнуў старапольскім выслоўем так сабе, без палітычнага падтэксту? Ён, вядома, за словам у кішэнь не лезе.

Як і я:

НАТАслоўцы

НАТА. Ад Наталій, Наталія (лац. natalis — родны).

Ната, Даната, Натан, Рэната, Фартуната.

Натала, Наталенька, Наталечка, Наталка, Наталанька, Наталачка, Наталушка, Наталька, Наталюшка, Натальля.

Натанечка, Натанька, Натанюшка, Натаня.

Натаха.

Натачка.

Наташа, Наташанька, Наташачка, Наташка, Наташонка, Наташонак.

Натка.

Наток.

Натоленька, Натолечка, Натолька, Натоля.

Натоха.

Натоша, Натошачка, Натошка.

Натуленька, Натулечка, Натулік, Натулька, Натульчык, Натуля, Натуня.

Натусенька.

Натусечка, Натусік, Натуська, Натуся.

Натушка.

Націк.

## Давай цэнтр Еўропы!

Падзеі пайшлі не ў той бок. Сталіцу свету з Масквы перанеслі ў Нью-Йорк. А на якога ражна? Каб з поступу часу ўвайсці ў наступ бясчасся? Муляла братняя рука дапамогі? Варшаўская дамова не падабалася?

Апанавала нас засцянковая мегаламанія. І выстаўляем яе як казырную карту. Куды ні накіруй тэлевізар, узбуджаныя дзяржаўныя твары. „Учарашнія” і „пенапластыкі”. Торжышча словаблудства!

Далдоняць да знямогі. Усе „най”. Усе за законы Дабра, Ісціны і Хараства. Бы зышлі з іканастаса. Палякі, чэхі, украінцы. Толькі ў Лукашэнкі крыважэрныя іскры ў вачах. Асабліва, калі даказвае, што цэнтр Еўропы ў яго. А ў каго цэнтр Еўропы, то вядома...

Каб толькі за чубы не ўзяліся. Нават урачыста-ўзнёслы Кучма тырчыць:

— Цэнтр в мэнэ!

Адкрыў спрэчную пупавіну ажно ў Карпатах. Гавел тэатральна надуўся. А ці мне апісваць, як гарыць нецярпеннем уступіць у бой каталізаванае сэрца Санюты Кваса?

І ўсё з-за перамяшчэння сталіцы свету, а з ёй і бескарыснай дружбы. Новы суверэн — не Хрушчоў, што за добры ўспамін падарыў Крым украінцам — навечна замацоўвае за сабою права віраваць планетай. Дык уладалюбныя еўрыкі схапілі за хвост хімеру, ілюзорную кропку на геаграфічнай карце. Толькі „цэнтр" не перадалі яшчэ амерыканцам. Мазгі даўно ўжо за акіянам. А сэрца? Чаму ніхто не хоча праліваць ні слёз, ні крыві за сэрца Еўропы? Пачуцці перамагла геапалітыка. Сэрца, нюхам адчуўшы працэс, саматрансплантавалася ў Новы Свет.

Застаўся „цэнтр". Хто пераможа? У Лукашэнкі нулявыя шанцы — сусветная супольнасць і Міранові́ч не дапусцяць, каб нелегітымны сатрап валодаў „цэнтрам". Кур'ёзным бачу анексіянісцкі сверб Кучмы. Гавел здасца без бою. Выходзіць, арэол славы ўзвенчыць узбуджаны твар недаспелага магістра.

І ён, у рамках традыцыйнай польскай талерантнасці, прымірэнча пацісне гаспадарскую руку двойчы магістру, і скажа;

— Я — Аляксандр і ты — Аляксандр; мы абодва пераможцы. Цэнтр у Белменіі. Сочтемся славою...

А мы? Што падкінута нам, звычайным заложнікам вялікай палітыкі? Калі паслухаць беларускіх вучоных, мы павінны толькі маліцца за грахі самаедства.

Затыкаю вушы.

## Плячо ў плячо з прэзідэнтам

*Увесь свет — тэатр, а ўсе людзі — акцёры.*
*Шэкспір*

Адны кажуць, час мяняецца. І заўсёды ў неспрыяльны бок для беларусаў. Іншыя перакананы, што кожны народ жыццё сваё робіць сам. Адны і другія адно гавораць, а іншае робяць. Як мой сусед. Непітушчы, а даказвае, што нарадзіўся з чаркай у руцэ. І алкашы падваротныя яму вераць. Клянуцца, што і яны з такога самага генафонду. Іх права, кожны чымсьці ганарыцца. Нас нічым не здзівіш. Толькі і ведаем, што пераключаемся з аднаго коду на другі. Тым больш маўленчага. Мова — пачатак наш і працяг. Хто гэта сказаў? Нейкі сляпы правідзец. Хоцькі — наш працяг!

Усё ідзе як мае быць. Правы чалавека? Аб чым вы, ахрыплыя клоуны словаблудства? Уздумалася Пазьняку паваяжыраваць па дыяспары — Very good! Пожалюста! Вырашыў Шарэцкі адмаліць старыя грахі ў Вострай Браме — гоп у Вільню! Намеціў Быкаў узяць Лінію

Манергейма — узяў. Вы, як сабе хочаце, а я за правы для Лукашэнкі. Што ён — не чалавек? Дык чаму вымушаны ездзіць на спектаклі толькі ў Маскву?

Але Лука ўзяўся за розум, даў дазвол на эксперымент — і ў Мінску ўзнік прэзідэнцкі тэатр. Значыць, я туды. А там чарга, як у польскім банку, разгалінаваная. У які хвост учапіцца, хто яго знае. Вымахваючы загранічным пашпартам, працiскаюся да касы. Чаравікі ўзнімаюць вэрхал:

— Нахабнік! — крычаць. — У чаргу!

— Я натавец! — бяру іх на кручок. — Бум-бум!.. Polska! Zagranica! — паясняю.

— Польшча не заграніца! — чую паўзабытую прыказку. — У чаргу! — не здаюцца. — Натапаніўся! — наступаюць.

З выбуховай сітуацыі выцягнуў мяне rodak. Пачуўшы польскую мову, ён клікнуў:

— Пан, иди сюда!

І прапанаваў за долары білет у мрою.

Увайшоў я ў фае і разгубіўся. Усе дзверы на замках. Адчынены толькі ўваход на сцэну. І туды плывуць шчаслівыя ўладальнікі білетаў. Уключаюся ў плынь. Уплываю на сцэну як артыст. Бачу, і іншыя пачуліся артыстамі. Былі імі і спусціўшыся ў глядзельную залу.

— Ці добра я трапіў? — пытаю суседа па мяккіх крэслах. — Гэта той тэатр?

— Той! — супакойвае сусед, ляпаючы мяне панібрацкі па плячы. — Будзь спок, Сіда...

Хто гэта? Па ўсім відаць, важны чын. І адначасова адкрытая ўсмешка радавога грэшніка. І вусы смаляныя дзіўна знаёмыя. Углядаюся... Лукашэнка!..

— Вайшол в театр — і ты воленс-неволенс до последней дзеі раб Melpomeny? — як роўны роўнаму тлумачыць высокі паплечнік.

Во дзе дэмакратыя! Сяджу з прэзідэнтам і не адчуваю, што ён прэзідэнт. Не бачу ў ім ніякага пачуцця ўласнай значнасці. Быццам сышліся старыя аднакурснікі. Ах, Сашка, Сашка! Даўно не бачыліся. Колькі зім, колькі лет! І табе здаецца, што я прызабыў цябе і не здагадваюся, кім ты стаў. А помніш Алачку-Людаедку? Як мы змагаліся за яе! А яна выбрала Лёньку...

А Сашка сваё:

— Понимаешь, автором проекта „Уваход праз сцэну” является директор театра, — накіроўвае мае думкі на патрэбны троп. — А толкнул на творческий взлёт я, — ганарыцца. — Директор точно испол-

ниЛ указ своего президента, — выяўляе дзяржаўную тайну. — Отличный парень! — хваліць.

— І талерантны народ, знуджаны фарсамі тупіковай апазіцыі, штурмуе касу прэзідэнцкага тэатра, — уваходжу ў слова.

— Ты, Сида, правильно меня понял, — сказаў прэзідэнт і падкрэсліў: — И учти, без применения силовых структур.

— Усё ў ажуры, — стаўлю кропку над „і”.

Раптам прэзідэнт насцярожыўся.

— А ты якой пазіцыі прытрымліваешся? — перайшоў на раўнапраўную.

— Прэзідэнцкай! — без замінкі выпаліў я. І ён, паклаўшы мне руку на плячо, моўчкі кіўнуў галавою і заглыбіўся ў падзеі, якія разгарнуліся на сцэне.

А я, пад свежым уражаннем перажытага, зусім адхіліўся ад тэатральнай пастаноўкі. Мае вочы затуманіла беспрасветная імгла, у якой узнікалі і раствараліся розныя акцёры гістарычнай драмы. Усе з аглабельнай кагорты. На бераг Новага Свету атлантычныя хвалі выкінулі зняможанага Пазьняка. Ачомаўшыся, прамаўляе ён да Статуі Свабоды і аб'яўляе Лукашэнку агентам КДБ і ганьбуе квазідэмакратаў з прэзідэнцкай „гунты”, што пайшлі на калабарацыю з „вар'ятам”. Быкаў, змяўшы Лінію Манергейма, ідзе на паўторны штурм Берліна. Бліскае высунуты ў рэванш валявы падбародак Мар-дэ-Янкі. За беларускую гасціну патрабуе ад цывілізаванага Захаду санкцый (не на каленях праводзілі). Змагарным пугаўём смаліць Лукашэнку наш Міранавіч: то за касацыю нацыянальнай памяці, то за патаптаныя сімвалы. Лясь-лясь-лясь! У арэоле славы на першы план выходзіць шчодры Шарэцкі. За стратэгічнае партнёрства ў барацьбе з „крымінальным” прэзідэнтам узнагароджвае „Ніву” спонсарскім фондам. За сцэнай чуваць дружны вокліч ніўскіх шчалкапераў „Служым Шарэцкаму!” Бум-бум-бум! Бах! На чале бандфарміраванняў урываецца ў мой калейдаскоп ярасны Шушкевіч. Шалее:

— Я паваліў Савецкі Саюз, павалю і Луку! — пора плакатаўказальным пальцам у нас...

Грымнула, ляснула, зашумела. І я за межамі рэальнага жыцця. Нейкі форум. У прэзідыуме кіруючыя галовы. На ўквечанай трыбуне прафесійны лапатун. Пляце кашалі з лапцямі. Слухачы заняты сваім: хто ў носе калупае, хто ў вушах. А найбольш кемлівыя сядзяць у буфеце: асвяжаюцца вінцом, падсілкоўваюцца „татарам”. Кіраўніцтву таксама маўленчая трыбуна не ў галаве. У калектыўным чэрапе варыцца інтэграцыйная думка: як мабілізаваць дысцыпліну аўдыторыі? Узнёслая ідэя стыне ў дрымотнай фазе варкі кіруючых галоў. Бедныя,

зрабілі б уваход у залу цераз прэзідыяльнае ўзвышша — і галаваломнае пытанне знікла б з павесткі дня.

Не дадумаліся. Якія цельпукі кіравалі намі!

## Палякі па выбару

Было ў лістападзе 1998 года. На тэлеэкране маладыя семінарысты. У чорным, на шыі белыя каўнерыкі (koloratki), у сэрцы жоўць. Утуліліся ў варшаўскія крэслы, узіраюцца з цікавасцю ў нашы твары і вандруюць у часе.

— Адкуль прыехалі?

— З Беларусі.

— Беларусы?

— Polaki.

Нарадзілі і выгадавалі іх бацькі — беларусы. У хаце гаварылі ўсе толькі па-беларуску. Так было заўсёды. Продкі таіліся. Нават перад сваімі дзяцьмі скрывалі тайну. Як ведаеце, у нас за адно польскае слова пагражала Сібір. Таму ў большасці беларускіх палякаў няма польскага духу. Выдухнуўся.

І стаўся цуд. Прыехаў з Польшчы ксёндз і вярнуў маладзёнаў на правільны шлях.

— Wpoiw duch polski (першы).

І маладзён opamientałsie.

— I ja apamientawsia (другі). Przyjechaw do Macierzy...

Як казаў з гэтага ж блакітнага акенца незабыўны Станіслаў Станіслававіч — okrześliłsia.

Фокус-марокус. З неба ўзіраецца ў нашы азадачаныя твары Касцюшка. Афішуючы пакутлівую грымасу, змоўніцкі міргае:

— Жыве Беларусь!

## Фалас лунае над Сеймам

У гарадах з гукам сыплюцца „шкляныя” дамы, у трушчобах бясшумна замярзаюць бамжы, вымірае вёска, карупцыя точыць дзяржву — усе даюць, усе бяруць. А над Сеймам лунае здань Фаласа.

Матэрыя дэбатаў не новая, з сеймавай гісторыяй: „Prezentacja organów płciowych w trakcie stosunku”. На затрыбунным экране эратычны канал. Знямоглыя ў эмоцыях паслы таўкуць у грахоўнай ступе губную пену. Ужо вызначылі грахоўнасць палавых органаў. Найперш падзялілі „інструмент”, які заўсёды носяць з сабою, на дзве катэгоры: „мяккія” і „цвёрдыя”. Паколькі пераважалі лысыя імпатэнты,

чупрынiстая меншасць пагадзiлася аднесцi „мяккiя” ў разрад безграхоўных. Бой успыхнуў за „цвёрдыя”. Імпатэнты аб'явiлi гэты гатунак ачагом парнаграфii i патрабавалi суровага пакарання: 10 гадоў турмы за само выяўленне „цвёрдасцi”.

У спрэчках выступiлi:

Я. Нямцэвiч (вiцэ-мiнiстр справядлiвасцi): — Нiдзе яшчэ ў Еўропе, а мо i на свеце, няма такога вобразнага паняцця парнаграфii. Мы апярэдзiлi Еўропу! Толькi трэба завастрыць форму „цвёрдасцi”, каб суддзi ў час працэсу не рагаталi.

С. Іванiцкi (AWS): — Пытанне да прэм'ера. Цi становiшча пана мiнiстра Нямцэвiча з'яўляецца становiшчам мiнiстра справядлiвасцi?

Е. Бузэк: — Гэта становiшча Мiнiстэрства справядлiвасцi.

З. Пупа (AWS): — Ваюем за Польшчу! Хай пан прэм'ер не ўхiляецца ад такой важнай справы. Хай пан прэм'ер скажа, цi пан за парнаграфiю цi супраць?

Э. Бэндэ (UW): — Прашу прабачэння, гэта дурдом?

Маршалак: — Пытанне не на тэму.

А. Бэнткоўскi (PSL) ставiць пытанне на тэму: — Калi селянiн асемяняе казу, гэта парнаграфiя цi навуковы эксперымент?

Маршалак: — Proszę o zachowanie powagi.

Я. Сасноўская (SLD): — Пара канчаць навуковыя разважаннi. Калi пачнём караць за калектыўны гвалт, а не за „цвёрдыя” карцiнкi?

Дэбаты скiравалiся на iмпатэнцыю Мiнiстэрства справядлiвасцi. Цiкава, чым закончыцца вайна з Фаласам? Дык сам белы папа прыхiльнiк гэтага бога. Усё заахвочвае да цялеснага кантачання.

Мая прапанова: трэба пачынаць з сябе, спадары засядацелi. Выдаць загад сеймавай стражы: — Упускаць у Сейм толькi „мяккачленных”, „цвёрдаiнструментальных” — у астрог!

Застаецца нявырашанай юрыдычная загваздка: колькi гадоў атрымае зламыснiк за парнаграфiю з законнай жонкай?

Але гэта я ляпнуў без канкрэтнага адрасу.

## Рэквiем Леанiду

Было ў Рыме. Каб паказаць сенатарам, што яны нiчога не значаць, тыран Калiгула даў сенатарскае званне свайму каню i прыводзiў яго на пасяджэннi сената.

Быў час, былi тыраны! У нашага тырана нават задрыпанай казы няма. Пакалiгулiў на нiўскiм палетку i без дай прычыны акапаўся на Белавежскай градзе. Каб паказаць, што мае нас у азадку, аб'явiўся царом Леанiдам i сцiпла назваў граду Тэрмапiламi.

Заняў самазванец глухую абарону і чакае вераломнага Ксеркса. А той аятала не ідзе. Не смаліць на граду і падмога. Дзе твой дух, Спарта? Сакрат, першы прыбочны, адкалоўся, працуе на свой імідж. Старыя зубры, спасеныя на датэрмапільскіх пашах, толькі варочаюць асавелымі бельмамі:

— Куды нам на тую граду! Захацелася яму крыклівай славы, хай і выстаўляе сябе на смех персам. З намі не раіўся, — ухіляюцца.

Спадзяецца Леанід на маладняк і наёмнікаў? Зубраняты затаіліся ў кустах.

— Мы б ахвотна, але месцайка знайшлі добрае.

Чакаюць пампезнага гладыятарства. А наёмнікі за

Сцяною. Вострацць мечы на Лукашэнку.

Ударыў мароз, а персаў няма. Стрымлівае паход Вялікі Брат (Сексаголік). Каб табе Монікай адрыгнулася, міратворац прытворны! Замерзне на праклятай вышыні наш герой. У імя чаго?

## Куды ідзем?

Склікаў Сакрат на плошчу маладзёнаў і сарамаціць:

— Гляджу на вас і збірае мяне на ваніты. Смажыцеся ў роскашы, распанелі, а хамуты. Якія ў вас манеры, якія норавы! Ненавідзіце аўтарытэты, не паважаеце старэйшых, дапякаеце сваім настаўнікам, спрачаецеся з бацькамі, прагна глытаеце ежу — і на вуліцу. І гэта называеце „быць сабою”. Куды ідзем?

З „Czasopisa” спісаў? Дык патлумачу: прыведзенай мною гаворцы дзве з паловай тысячы год. І адрасавана была не нашым zajebestym бязбацькавічам, а маладым грэкам. І прапаведаваў вялікі мысляр, які „за ўвядзенне новых багоў і за разбэшчванне моладзі ў новым дусе” быў пакараны смерцю (прыняў атруту).

Той Сакрат шукаў адказу на пытанне, як трэба жыць: „Пазнаць самога сябе”.

Крыноцкі мысляр не толькі пазнаў самога сябе, але і Еўропу. З плённых назіранняў і вырасла ў Крынках, на ўзор Гедройцавай Maisons Lafitte, Villa Sokrates. Не думайце, што Еўропа абсыпала нашага мысляра грашыскамі — ажыццявіў ідэю коштам роднай хаты. Раскашэліўся Сакрат, пабудаваў не якую-небудзь нашаніўскую „Хатку”. Villa Sokrates — поступ часу. Гучыць!

А казаў, што стаміўся і думае толькі пра рыбу. Віншую, Сакрат! Не прыкідвайся, што не волат. Ты і вялікі стратэг. Дасі цяпер прыкурыць суседскаму Лукашу. І цемрастоцкай Лукашчысе наладзіш Тэрмапілы.

Веру, узнімеш дух у элітах. І zajebesty маладняк у рот твой глядзець будзе. І Мілаш будзе, і Быкаў будзе, і Акадэмія. Толькі навошта ўзнаўляць твор вучня цёзкі. Цёзка выкладаў на вуліцы. Меў клёк. Тады б і я падвучыўся. Табе відней.

А калі ў Акадэміі стане душна, калі надакучаць маладыя юрліўцы і элітарныя зануды, мо заглянеш і да мяне. Ведай, у табе і мая надзея. Толькі не каркай, грымець трэба! Цыкута выйшла з моды.

У ясны заранак!

## Загуменне

Паэт ходзіць у пары з Лянотай. Заўсёды па сумежжы явы і сну. Пара сінтэзуе, акрыляецца, траціць пачуццё рэальнасці. І выдае радок:

„Колькі ў небе зор, цяжка палічыць”.

Услаўляе выснову гультаяватага героя. І эстрадныя пеўнікі тыражыруюць невуцтва:

— Цяжка! — стогнуць, лыпаючы ўвысь пакутнымі вачыма.

Вядома, заданне вам не пад сілу. А вучоныя асілілі

высь, назвалі дакладныя лікі. Выйшла: зорак у небе больш, чым пясчынак на ўсіх зямных пляжах. Карціну паяснілі: зоркай з'яўляецца і наша Сонца. У кожнай зоркі свае спадарожнікі. Адным з іх — Зямля, зацярушаны ў галактычным мроіве загуменны шарык.

Зоралічылынчыкі не пераканалі зямлян. З Зямлі не счэз заваёўніцкі дух. Нам, як таму паэту, усё здаецца, што мы — пуп усяго. І мы, у шале самаўлюбёнасці, хочам напоўніць сабою космас, і валодаць ім.

А там мясцовыя дэміургі стварылі незямныя гатункі насельнікаў. У іншым вымярэнні і мы іншыя. Дык тыя, убачыўшы лупатых Галавасцікаў на цыбатых канечнасцях, зачыняць перад намі ўваходныя дзверы:

— Дэгенератаў у нас сваіх хапае,— скажуць.— Марш за гарызонт падзей! — скамандуюць.

Бітвы пад выглядам уладкавання сусвету ім чужыя. У іх свае норавы, свая філасофія, свой парадак. Магчыма яны і не прыкмецяць зямнога дрангу, прымуць нас за аблупленых павіянаў і змесцяць у вальеры малпападобных. І наш паэт, замест пакаяння, абвінаваціць неба і панясе крыўду сваю ў глухую даль:

Колькі ў небе зор, не буду лічыць,<br>Неба зорнае не для нас гарыць.<br>Гэта вы, ліхтары непагасныя,

Увялі мяне ў зман, у сны ясныя.

Гэта аптымістычны варыянт. Аптымізм усяляе і амерыканская страховачная фірма Hermits Trail. За 100 долараў — смешная сума! — застрахуе нас ад касмічных захопнікаў, і мы зможам выпінаць свае мясістыя сядальныя паўшар'і, па-зямному выказваючы пагарду да закавырыстых абарыгенаў. Трэба меркаваць, што пры дапамозе клінтанлогікі дакажам фірме, што мы не напалі на касмітаў, а яны на нас. Толькі якая вартасць долараў на галактычных выспах.

Горш будзе, калі напорамся на бяздушных кібаргаў, засартуюць у касмічныя адыходы і спусцяць асенізацыйнай трубою ў чорную дзіру. Калі пашанцуе (толькі якім цудам?), можам трапіць у антысвет. Радасць малая. Там антылюдзі, антымы. Дакрануліся да антысябе — супербліц, зніклі ў моцнай успышцы святла. Бясследна.

Во якія трэлі. А ў „Полымі” несмяротны сюжэт — радуйся, жыві, ды спявай пра мілую згоду неба і зямлі: З неба зорачка ўпала, Прама міламу ў штаны. Хай бы ўсё там адарвала — Не было б толькі вайны.

Якое багацце душы! Якая ахвярнасць! Беларусачка, у карысць высокай ідэі, зракаецца „ўсяго”. Адначасова з прачуленых радкоў вылазіць невуцтва, цямнота. Здарожаны мільёнамі светлавых гадоў, зваліўся на Зямлю звышмагутны носьбіт разбуральнай энергіі (апакаліпсіс!), а дзяўчына яшчэ і лашчыцца да яго — „зорачка”. Бы да прадвесніка зямнога шчасця.

О, мая зыркатая! О, мая наіўная! О, мая лянотная... А штаны якія!

## Хто мы такія?

Нам заўсёды ў прыклад ставяць палякаў:

— Во нацыя! Якасны сплаў.

— А які тыгель? — пытаю. — Колькі ў ім Polaków, Niemców, Czechów, Litwinów, Łotyszów, Goralów, Ślązaków, Cyganów, Turków, Tatarów? Нават Kuskowi Moskałów!!! Толькі Żydów і Bialorusów няма. Ні на лякарства.

— Хамская нацыя! — хрыпіць з Гродна крэсавяцкі бард.

— Каго маеш на ўвазе? — натапырваю вушы.

— Беларусаў, — сапе.

— Няўдзячыня жлобы! — адтуль жа ўторыць яму пан Малевіч. — За курорты ў Лукішках і Картуз-Бярозе раззбройвалі сваіх паноў, Пінск здабываць хацелі...

Здзіўляецеся? Дык і ў Беларусі няма ніводнага Беларуса. Адны „ічы”, „укі”, „онкі” і „енкі”. Кожнага ўвядуць у зман.

А хто ў белменным тыглі? Германюк, Швед. Ускочыў Латышонак. І ўсё. Ніводнага Беларуса. Які воўк у якую пушчу іх паперацягаў? Абярнуліся ў насельнікаў, самавызначыліся. Блізкія і далёкія, відушчыя і сляпыя, вядомыя і невядомыя, вялікія і малыя, ганаровыя і ганебныя, добрыя і злыя, светлыя і хамуты, свядомыя і несвядомыя, левыя і правыя, чорныя і карычневыя, тутэйшыя і мысцовы, выкраінцы і руські, карытнікі і porządni, prawosławni i Słowianie, учарашнікі, сеннікі і заўтрачы. І дзіва дзіўнае, з прыходам буржуяў зніклі бебурнацы. У нас усё як не ў людзей.

А якія нашы роды! Беламызыя, Белавусыя, Белазорыя, Балдакі, Баркулакі, Блуднікі, Блізнюкі, Бізуны, Бобікі, Бобрыкі, Бонды, Бузуны, Бурылы, Гадуны, Галаўні, Галышы, Гарбачы, Галадкі, Галаскоў, Гарачыя, Дубіны, Дылі, Казарэзы, Каты, Хаботкі, Хвайкі, Хранюкі, Церабеі, Часуны, Чарапкі, Чобаты, Каўбасюкі, Каўтуны, Каўшылы, Кіндзюкі, Курдзюкі, Налівайка

Глытнулі!

Ніяк не магу ўцяміць, чаму наш найслаўны паэт, ідучы ў свет з патрыятычнай заявай „Я — беларус!”, не ўзяў з сабою і адпаведнай заяве шапкі. Як прыемна лунала б у свеце гордае імя „Беларус”. Не, падшыўся пад шведа.

Няма нашага імя на блакітнай планеце. Праўда, у час суседскай перабудовы бачыў я на беластоцкім рынку мінчука („енку”) з намаляванай на спіне шыльдай „Я — Беларус”. Ды насіўся ён з гэтай ношай як курыца з яйкам, і хутчэй нагадваў камічнага цыркача, чым нацыянальнага героя.

Дык хто мы такія? Куды шлях трымаем? На Пінск, як пагаварвае гродзенскі баламут, ці на Захад?

Адны кажуць:

— Беларусы — талерантны народ.

Другія аспрэчваюць:

— Беларусы не столькі талерантны, колькі баязлівы, нясмелы народ.

А я пратэстую! Мы не дужа ваяўнічыя і не асабліва палахлівыя. Мы з гістарычнага сплаву — прабеглыя, з пекнай будучыняй, круцялі.

Усміхніцеся апануранья Сакраты, свет пабудаваны пад наш нораў.

## Флюгер

Як ні дзіўна, але П. Філюку заўсёды сняцца праведныя сны. Дзякуючы ім стаў ён пазачасавым шчалкапёрам. За маанцаў славіў

героя ўвекапомных дзён, узнімаў сцяг перамогі святла над цемрай, а перш за ўсё — даказваў шляхетнасць свайго роду і фальшывасць Арцёмкіна і ягоных нашчадкаў. У выяўленчым запале губляў пачуццё рэальнасці. Арцёмкіны былі на плыні і маанскі веснік, каб не прыдбаць уплывовых ворагаў, не пускаў на свае палоскі мройных наскокаў ідэйнага маанца, чым наклікаў на сябе справядлівы гнеў мройніка. Сны рваліся, затым выбухалі з новай сілай. П. Філюк не здаваўся ў баях за новы лад.

Прайшлі гады. Задрыпонія вярнулася ў ранейшую стадыю. Маанскі веснік разам з маанцамі кануў у Лету. На небакраі адроджанага жыцця нарадзіўся і адэкватны вястун — выразнік запаветных дум сонцавітаў. Паплылі новыя казкі і новыя песні. І першым запявалам аказаўся авангардыст маанцаў. Цяпер, узяўшы на ўзбраенне святыя вартасці, паганіць чорную ноч маанскай акупацыі і славіць узышоўшае над Задрыпоніяй доўгачаканае сонца. Заадно сноўдае змагарным пяром у азіяцкія рылы былых саратнікаў.

— Кожны нумар адкрывалі партрэтам свайго любімага правадыра, — дакарае. — Крытыку душылі!

Ведае, хто ж будзе рыцца ў ягоных снах. Спадзяецца і на маанцаў: не пакінулі ж сонцавітам неапублікаваных мрояў. На ўсякі выпадак застрахаваўся ўсхваленнем Арцёмкіных, заганы якіх у новай рэчаіснасці набылі станоўчую якасць.

— Ганаруся такімі землякамі! — заявіў.

Убачыў П. Філюк і страшны сон: сусед Васька Ук, якога надоечы сцябаў за службу ў грахоўнай маанскай фармацыі, зноў наверсе. Дык прачуліў гонарам і сяброўствам Ваську.

Флюгерны П. Філюк. Не вырывайма яго з гаючых сноў. Можа прачнуцца ў непрадбачанай рэчаіснасці.

## Сценька Разін сатаніст

Два Нулі абрынуў на М. Х. усведамляльную дубіну за рускія песні, якія яшчэ сёй-той шануе ў Беластоку. Іх нават тут любяць! Вось праваслаўная супольнасць запрасіла да сябе рускі хор з Вільні. (І там яшчэ любяць рускіх?) І ён, замест літоўскіх песняў — які скандал! — выконваў рускія. Прыехалі з еўрапейскай Літвы, дык спявайце палітоўску. А ніўскі карэспандэнт хваліць азіятчыну.

— Як гэтакі здзек можна цярпець! — дубасіць паслядоўнага русафіла павернуты праведнік. — Рускія песні спароджаны сатаною! — хвошча актуальнымі каштоўнасцямі. — Нічога ў іх няма чалавечага, адно цемра і дзікунства, — павучае.

Успамятаў хмяльнога Сценьку Разіна, станістую персіянку і вясельны эпілог? Во дзе вытокі расійскага духоўнага спустынення! Забыў знаўца рускай душы, што данскі казак падарыў красуню маці роднай, Волзе. Гэта не ахвяра цёмным сілам. Сценька не сатаніст. Атаманавы вочы наліліся пунсовай кроўю ад насмешлівага гоману таварышаў:

*Нас на бабу променял,*
*Только ночь с ней провожжался,*
*Сам наутро бабой стал!*

У імя чаго ён рашыўся на нестандартны пачын?

*Чтобы не было раздора*
*Между вольными людьми,*
*Волга, Волга, мать родная,*
*На, красавицу прими!*

Перамагае брацтва, святое пачуццё. Два Нулі прапануе, замест рускай удали, захапляцца дзявэчкай, што ідзе ў лясэчак на шурум-бурум з мыслівэчкам. Таксама хмяльная песня. І я не буду нагаварваць 00, каб ён не атоесніваўся з мыслівэчкам. Кому нравится попадья, а кому попова дочка. Толькі навошта падкладаць пад мастацкі твор высакамерныя адносіны да суседняй мовы? М. Х. мае права любіць яе. Навошта абвінавачваць яго ў здрадніцтве інтарэсам сусветнай супольнасці?

Тут Два Нулі ўваліўся ў гнойную яму. Нявед чаму, прывёўшы ў сведкі Пушкіна, паставіў рускага генія фронтам да цемры:

— Ці ж Пушкін не быў расіянінам? — звяртаецца да нас адыёзны русафоб. — А што пісаў? — прывязвае М. Х. да ганебнага слупа:

Прощай, немытая Россия!..

Дзе ты, чалавеча, нарадзіўся, і дзе рос? Не гавару, у каго вучыўся.

Па-першае: нічога падобнага Пушкін не гаварыў. Радок вырваны з вядомага верша Лермантава. Па-другое: не тычыцца ён рускай мовы. Уставім у кантэкст:

*Прощай, немытая Россия,*
*Страна рабов, страна господ,*
*И вы, мундиры голубые,*
*И ты, им преданный народ.*

У жандарскіх мундзірах убачыць мову? Віншую з суперзоркасцю! Няведанне — сіла!

## Зямляк

Пад нулявы год паплылі на поўдзень у легендарную пячору паломніцтвы павернутых бязбожнікаў. А я, кіруючыся карытным патрыятызмам, падаўся на поўнач, у не менш слаўную калыску. Значыць, я ў Гданьску. І, ног пад сабою не чуючы, проста з вакзала пру на ўсвенчаную Палянку, каб ударыць чалом Чарадзею, што зямную юдоль напоўніў блакітнымі снамі. І лбом у браму. Назад! Стража. За плотам псрабрэх сабак. І зоркі ў вачах. Бы ў віфляемскую ноч. Толькі куміру пакланіцца не дазваляюць.

Ажно заззялі іскаркі надзеі. Адчыняецца пасадная брамка і выходзіць з яе — хто б вы думалі! — махнацкі Куптэль. Праменіць незямным шчасцем. Мяне не прыкмячае.

— Зямляк, ад чаго ў сёмым небе? — падаю голас.

— Збылося! Збылося! — хапаецца за галаў у радасным ап'яненні.

— Што збылося? — падказытваю.

Куптэль ачнуўся. Акінуўшы маю фізіяномію пагардлівым позіркам, скрыгатнуў зубамі і гыркнуў:

— Прынялі на службу.

— І белменаў прымаюць? — прыкідваюся наівам.

— Толькі мусульманскіх! — ганарыцца.

— Абмусульманеных? — удакладняю. — Праалбанскіх?

Маўчыць.

— Мо за „капцёвага” будзеш? — намякаю на вакантны чын.

Круціць асуджальна галавою. Яго, бач, не задавальняе такая пасада.

— Цяпер ты ў маіх руках, — нечакана Куптэль мяняе крэн, надаючы размове злавесны сэнс.

— Ведаю, — уздыхаю з сумам.

— Гаўно ты ведаеш! — узрываецца ён і, вытрымаўшы драматычную паўзу, заганяе мяне ў капкан:

— Гайнюшы я! — сказаў падкрэслена.

У гэтай інтанацыі было ўсё: гонар, слава, сіла.

— Дык ты сабакар? — брыдка здзіўляюся.

— Прэч з маіх вачэй, сербалюб цвёрдахрыбетны! — увайшоў зямляк у новую ролю. — Будзеш прыставаць, спушчу ўсю гайню, — паабяцаў. І, узняўшы ў неба рукі, з воклічам „Алах акбар!” жвавымі падскокамі пашыбаваў у горад.

Канец казкі. Выкінь, Сідар, з галавы дурную мрою, змірыся з думкай, што не быць табе блазнам Калысніка.

## Брусельская вуліца

Як сказала ў блакітным акенцы белвытоцкага тэлека вяковая бабулька, чалавек такі дурны, што ўсім цікавіцца. Так было і са мною. Даследуючы ўрочышча Багна, што чаўкае на ўсходняй, свойскай, сцяне Вялікага горада Беластока, забрыў я ў засценную Грабаўку і пацікавіўся засценкам. Бы ўступіў у слынную песню Ніны Мушынскай пра вотчыну Хадкевічаў. Ні то горад, ні то вёска. Усё ўладкавана на той жа манер, няма толькі гербавых рэшткаў. І тым не менш сярмяжнае закуцце падкупляе шчырасцю памкненняў.

Гэта вуліцы. Ды якія: Adeńska, Afrykańska, Amerykańska, Berlińska, Brazylijska, Brukselska, Dakarska, Egipska, Europejska, Helsińska, Hiszpańska, Kairska, Londyńska, Madrycka, Ottawska, Paryska, Portugalska, Praska, Rzymska, Waszyngtońska.

Афрыка, Амерыка і Еўропа ў абхваце распасцёртых рук. У вас не закружылася галава? Не бяда, ачуняе галаву вуліца Bajeczna, верне настрой — Morelowa, уселіць дух гігантаў — Sekwojowa, дасць сілу — Hebanowa, голаў узвенчыць — Oliwkowa. Ці ж не казка?

Спружына разняволенай творчай свядомасці напружвае памяць, выпроствае разумовыя звіліны. Маланкавы пробліск інтэлекту высвечвае тайну. Вуліцы ў гонар землякоў!

Ху ёсць ху! Недзе на аравійскім паўвостраве абмусульманены на ўзор Куптэля грабаўчук падносіць мясцоваму шэйху рытуальныя шлёпанцы,— б'ём чалом! — вуліцу, на якой жыў, называем Адэнскай. Вашынгтонскаму чысцільшчыку гарадскіх прыбіральняў, які выйшаў у Новы Свет з Грабаўкі — ганаровая вуліца. Канцавой Маньцы, служанцы берлінскага бюргера, нізка кланяемся — трымай сваю вуліцу! І гэтак далей...

Таксама ўражвае. Колькі заслужаных для сусветнай супольнасці людзей выдала правінцыйная пустэльня! Тут аднак насцярожвае аднабаковы крэн. Дзе спрадвечнае балансаванне паміж Сцылай і Харыбдай вялікай палітыкі?

А можа гарабаўчукі ўхвалілі новую стратэгію ўваходу ў Еўрасаюз? Ці выпадкова не тут будзе сталіца гэтага стоўпатварэння? Ці ж Брусельская вуліца не тонкі намёк?

Разнявольце, чытачы, і вы сваю творчую свядомасць і разгадайце загадку: якія краіны і гарады мэтанакіравана не ўключылі ў засценную агламерацыю мройныя грабаўчукі?

Хто дасць правільны адказ, той паедзе на Каўказ. У самую гарачую кропку!

## Патэнцыял немачы

Стратэгія — майстэрства вядзення буйных аперацый (ваенных, эканамічных). Надоечы стратэгію перабудовы Падляшша распрацоўваў у белавежскай Зуброўцы міжбугаодэрскі штаб навукоўцаў, палітыкаў і бізнесменаў. Асаблівы падыход да справы праявілі падляшскі маршал Згжыва і эканаміст Зялінскі. Першы, прывітаўшы стратэгаў, празорліва адасобіўся і да канца нарады плённа вывучаў духоўнае змесціва белавежскага рэстарана. Другі, пачуўшы слова „стратэгія”, выхапіў з-за пазухі пісталет і нацэліў агнястрэльную зброю на д-ра Анджэя Марыю Фалінскага, дырэктара ўправы Прамыслова-гандлёвай палаты заграніныx інвестараў, які плёў з дуба вецце, накіроўваў увагу на вялікі капітал.

— Больш ні слова! — узарваўся эканаміст, кіруючы знішчальны позірк на дула зараджанай цацкі.

Калі штабісты гуртам абяззброілі гаспадарчага каўбоя, той апраўдваўся:

— Са мною гэтак заўсёды. Як толькі пачую слова „стратэгія”, адбяспечваю пісталет.

Рэфлекс Гебельса, — падумаў я. Той, трэцярэйхавы доктар словамётнасці, адбяспечваў свой пісталет на слова „культура”. І ўспомніліся іншыя словамётчыкі.

Неспакойнае пасляваенне. Прыбелавежжа. Ад вёскі да вёскі з пісталетам у кішэні гойсае чупрыністы паэт. Схіляе маіх землякоў на дабравольны выезд у БССР. Сам потым хваліўся. Хто? Максім Танк. Тут усё было ў ажуры. А вось Танкаў паслядоўнік апраставалосіўся. З пісталетам, уваткнутым за нагавічную дзяжку, уварваўся на трыбуну маладых польскіх пісьменнікаў (1946). Ці дзяжка была слабая, ці нагавіцы завялікія, але калі юны і нявопытны чэкіст павёў гістарычную атаку на „Пакаленне” Братнага, пісталет вызваліўся з уціску дзяжкі і грымнуў на падлогу. Было смеху. А смяяліся з Віктара Варашыльскага, майго другога знаёмца.

А я ў той час, вызвалены з прускай прымусоўкі, канаў на чужой зямлі пад дулам варашылаўскага стралка. Быў ім мой камбат, цар і бог у сваім хозяйстве, у цвярозым стане нармальная асобіна, а нап'ецца — звер. І рэфлектаваў па-звярынаму. На сам мой від. Выхапіць з кабуры пісталет і раве:

— У бью!

— За што? — здзіўляўся я, не чуючы за сабою ніякай правіны. А ён сваё:

— Убью, сволоч!

Удумаўшыся ў паганы намёк, змяніў я тактыку. Пачаў дзейнічаць, зыходзячы з абстаноўкі. Першы ўдар наносіў у грудную клетку камбата, другі — у сонечнае сплячэнне. Метад дасягаў мэты. Пісталет, як у Варашыльскага, ляцеў на падлогу, камбат валіўся на тапчан і пераўтвараўся ў аморфны від. Ацверазіўшыся, злосці на мяне не насіў, нічога не памятаў, толькі непакоіўся:

— Понимаешь, связной, вчерась потерял пистолет, — уводзіў у тайну. — Военное имущество! — паясняў. — Ты, случайно, не нашёл? — цікавіўся.

Не цяжка здагадацца, што я „згубу” знаходзіў. Камбат выносіў мне благодарность, я — стаўшы ў струнку — выказваў рытуальнае „Служу Советскому Союзу!” і да наступнай афіцэрскай папойкі цешыўся жыццём.

Ды гэта быў прадукт змрочных гадоў алавянамоўнага стагоддзя. А белавежская баталія разыгралася на парозе тэхнагеннай эпохі, новага разумення саміх сябе. Паказчык майстэрства той жа — смехатворны.

Хоць рэліктавы ваяка ўціхамірыўся, стратэгі здаліся патэнцыялу немачы. Зразумеўшы марнасць разумовага намагання, рэклі:

— Няма ідэі на Падляшша. Невядома, што з гэтым закуццем рабіць.

І раз'ехаліся па хатах. Патэнцыял немачы ўзяў верх над майстэрствам.

А падляшскі маршал — правідзец.

# З сябравіцкага тэлетайпа

*Дэмакрыт, каб не адцягвала ўвагу мітусня, асляпіў сябе.*
*Хваліўся Валэнса, што за сваё жыццё не прачытаў ніводнай кніжкі.*

*У Заіры адно з плямёнаў народнасці балуба вызначае годнасць нявесты па колькасці мужчын, якія авалодалі ёю да вяселля.*

**Дзедзічы цемры**

Дэмакрыт — вялікі грэк,
Хоць сляпы, прыйшоў у наш век.
А ў нас — наадварот —
Слепне ад хады народ.

Веды West увапрог у рэйд,
Там навука водзіць рэй.
А ў нас — наадварот —
Невукам глядзім у рот.

У Балубіі ўжо рай,
Колькі хочаш, Ева — май.
А у нас — наадварот:
— Не чапай, душа за плот!

*Лайнанізм — мімалётная пусцяковіна на фасадзе гісторыі.*
*Юрась Бузук*

**Паддоследны**

Яго ляпілі лайнанякі.
Гліну разбавілі лайном,
Мозг закупорылі у с... —
У навуку ўводзілі пралом.

Паўвеку ведамі нябогу
Згіналі злыдні у дугу,
Бралі тытуламі ў аблогу.
Аб гэтым сёння ні гу-гу.

Аб гэтым сёння думаць горка.
Гляньце, як выпрастаўся ён!
Куды вядзе наша гаворка?
Дык які дослед — такі плён.

**Учарашні**

Жыў нармальна. Сыта еў,
Пасля першай не хмялеў.
Любіў мір. Удоваль спаў.
Бліжніх жонак не чапаў.
Сваю дарма не лупіў.
За свае, пэўна, не піў.
Гонар меў. Такі ўжо род.
Шанаваў яго народ.

І гэткі герой прыкметны
Апынуўся ў апраметнай.

З-за каго? І з-за чаго?
А хто ведае яго.
Верны быў, усім служыў,
Дружбай з людзьмі даражыў...

То і ў пекле паслужу,
З сатаною падружу.

**Спазнай сябе**

Апакаліптычная
пачалася драма,
як з ліянаў
голага
спусцілі Адама.
Падкалодны злыдзень
да сексу прымусіў?
Так добра жылося,
як насіў нас бусел.
Запусціў у канвеер
ты дурную сілу,
ад яе і род наш

цягне ў магілу.
У „Дольцы" паратунак,
у навуковы шэраг!
Ганьба! — чарнарыжцы
асвяцілі чэляс.
Апакаліптычная
пачалася драма.
Дарма, Чарлі, з дрэва
ты сцягнуў Адама.

**Па катэхізісу Бэлзы**

— Хто ты гэткі?
— Свой. Тутэйшы.
— Твае продкі?
— Усе памершы.
— Бацька? Маці?
— Сірата.
— Прафесія?
— Басата.
— Лясун, мусіць?
— Я з палёў.
— Палюхом запішам — як?
— Я з палёў, значыць — паляк!

**Зварот Івана Кірызюка да Бога,**
**або**
**Як цяжка беларусу быць украінцам**

Дивлюсь я на небо
Та й думку гадаю:
Чому ж я не сокіл,
Чому не літаю?

Чому ж мене, Боже,
Ти крилець не дав —
Я землю б покинув
Та й в небо злітав.

Обридло в Підляши
Сіяти культуру.

Тут люди не наши,
Ні з пня, ні з натури.

Ідеш до іх з медом,
Гиркнуть чужим рэхам.
Сусід вжэ став шведом,
А голова — чехом.

Поміняли предків,
Поміняли віру.
І кажуть, що рід іх
З литвинскога віру.

Ходжу по „Стіни" я —
И світ мне не милий.
Зову: — На гостинець!
А чую: — На мыла!
О, люди, кохани!
Забути Могилу?
Коріння? Слов'яни!
— Okur-de! У магілу!

Забули про Бульбу,
Тарас тут не в моди.
Одно тільки гульби
Живучи в народи.

Стояти на варті —
Іты проти сили:
— Лай — кажуть — паўкварты,
А не — Тэрмапілы.

Впусти мене, Боже,
На кращу планету.
Нема лишку крилець —
Дай чек на ракету.

**Пан Філюк**

Сніцца пану Філі сон,
Быццам ён Напалеон:

Б'е направа і налева —
З прафесійным б'е прыцэлам,
Каму ў мызу,
Каму ў бок.
То падчэпіць гакам знізу,
То садане зверху ў клёк.
Будуць помніць праз вякі,
Як біліся Філюкі.
Сёння квасіў нос маанцу,
Заўтра Арцін знішчу род,
„Ука” Ваську зраблю здрайцам...
Хунвейбіню? У ноздры дрот!

Аж прысніўся сон гадзючы,
Быццам ён, Бэніта — дучэ,
Просіць Чэрчыля гарантый,
А Берлін: — Адоль, avanti!

У прывід дуляй садануў —
Выганяе сатану.
І пад труб анёльскіх рокат
Узнімаецца ў аблокі.
Сніцца яму, што з вякоў
Нясе радасць і любоў.

Ну і ну! Дык не цяльпук!
Ну і спрытны пан Філюк.

**Ачалавечыліся**

На экватары ў лясах жылі прыматы,
Па экватары круціліся, калматыя.
А хто ўлева ці ўправа ўбакавіўся,
Той хвастом накручаным накрыўся.
Грэла сонца — на галінах загаралі,
Ночы ў вечных футрах караталі.
Ні СНІДу не ведалі, ні бяды,
Хапала ўсім какосавай яды.
Аж з'ехаў у буш аблуплены галяк,
Ні то гарыла, ні то гляк.
І запісаў нас у род свой гамінід.

Адняў какосы. Кажа, што за СНІД.
Загнаў у клеткі. Пэўна на вякі.
Завошта? Адкажыце, сваякі.
Ачалавечылася малпа — і прыплод
Ганьбай пакрыў увесь малпін род.

*У час капітуляцыі мы з Родзькам паехалі ў Польшчу, каб перабрацца ў Белавежскую пушчу. Па дарозе Усевалад пазнаёміўся з маладой жанчынай. Спыніліся ў Беластоку. Нам далі працу паблізу горада. Памятаю, як я і Усевалад выйшлі на верхавіну гары і бачылі, як савецкія самалёты бамбілі партызанаў у лесе. Родзька часта хадзіў да той жанчыны, хацеў праз яе навесці сувязь з польскай партызанкай. Аднаго вечара ён кажа: „Пайду да жанчыны”. Тэта быў астані вечар, калі я яго бачыў (з друку).*

**Герой**

Кацілася слава
за Нёман,
за Віслу
пра ўдарны Родзькаў
дэсантны батальён.
Быў Родзька ў Варшаве —
выпаў такі гонар.
У Маравіі буйным
стратэгам слыў.
Не кланяўся кулям,
ішоў насустрач смерці,
у Белавежскай пушчы
прагнуў злегчы ён.
Рускія пілоты
адцялі дарогу,
разбамбілі пушчу,
у аблогу ўзялі.
Куды было дзецца?
Як прабіць дарогу
у запаветну мару,
як здзейсніць прарыў?
Успомніў Родзька польку,
маладую „дрольку”,
якую ўключыў быў

у стратэгічны план.
На гары высокай
размясцілі штаб свой.
Родзька, Еўропа
на цябе глядзіць!
Зашумела рэха
у Бел-высока-стоку,
праводзіла Родзьку
у апошні бой.
Коцяцца з гары той
з Родзькам яго словы,
а сябар згарняе
іх у сваю далонь:
— Скажы Еўропе,
што палёг на ж...
А рэха агучвае:
— „Дролькі” маладой!
Гуляла, гуляла,
дарог не губляла
баявая слава.
Бой!
Палёг трыумфальна,
амаль сюррэальна:
было „ах” і „ой” —
палёг як герой.

*Як паведаміў друк, правы ваявода назначыў дырэктарам шпіталя сябра па ідэі і адукацыі. Новага шэфа вітаў увесь персанал і пацыенты (яшчэ на ходзе).*

**Па старой звычцы**

Праспявалі дружна Sto lat!
— Спецыяльнасць? — Трунар-столяр,
Па-хатняму дамавіншчык.
Тапорыкам ножку чык!
— Ну і што? — пан ваявода —
Думалі, магістра дам?
Камуняку? Сатану?
Хутчэй скокну у труну!

**Настрашыла**

Гаварыла баба дзеду:
— Я да Клінтана паеду.
Ты, як цар Барыс, абвяў,
Даўно мяне не чапаў.
— Ну і едзь, такой бяды! —
Кажа дзед. — Даўно б туды!
Дзябёлая ты. Масці пікі.
У поцемку — дублет Манікі.

**Крыноцкі роздум**

За лясамі, за гарамі
Жыў Сакрат, мысляр з вусамі
І з курчавай барадою
Старагрэцкага пакрою.
Маладым задаваў тон —
Арыстып, Эўклід, Платон
Выйшлі з-пад яго рукі.
Усіх праславілі вякі.
— Вялікая, цёзка, справа
Ў жыцці ўвайсці ў славу.
Так, калі ўначы не спаў,
Мысляр з Крынак разважаў.
— Зведаў свету я нямала:
Нью-Йорк, Лондан, Парыж, Рым.
Усюды грэк я. Жоўць навалам.
Хоць ты у Афіны пры.
— A, Sokrates! Witaj w domu!
Перадай паклон Афону, —
Па плячы мяне паляпаў
Сам найбелы польскі папа.
— Święty Ojcze, jam z Warszawy!
Не вусата-кучаравы.
Jeno imię...
— Wiem skądeście.
Што чуваць w litewskim mieście?
— Przenajświętszy nasz, aliści...
— Niechaj cud się w Krynkach ziści.
— Jeno cud?

З вякоў: — Халоп!
У цябе ж Сакратаў лоб.
Дык мазгуй — у цэль глядзі,
Паству ў Крынкі не вядзі.
Кіруй блудных новым тропам,
Не на Усход — у Еўропу!
А як мяне прысабечыў,
Слухай не сябе, а веча.
— Вось яно што! Вось яно!
Хамам волю, мне — ярмо?
Пацалуйце мяне ў ж...,
Зраблю з Крынак Еўропу!
Ну й асілак, ну й яцвяг —
Наш пачатак і працяг.

**На Русі**

На Русі ў цане вякі
І плодныя мужыкі.
А тут час гулагаплённы
Вычасаў юр пагалоўна.

Першы ўзняў надзеі зніч
Мікіта Сяргеевіч.
Пры вусатым дэмане
Выстаяў пандэмію,
Бацьку сунуў фігу
І сплодзіў адлігу.
Брэжнеў — маршал і герой —
Сплодзіў валавы застой.
Галоснасці спее плод.
— Горбі, Горбі! Поўны ход!..
— Айн момент!..
У пару мядову
Сплодзіў Горбі перабудову.
Цар Барыс — хвацкі рубака —
У ідэі поўзаў ракам.
Хоць прастол пакінуў годна,
Быў вяршыцелем бясплодным.
Кануў у Лету спэцканы
Без цаны Дом Ельцыных.

**Пад Купалу**

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У хвацкай такой грамадзе?
— Шушкевіч.
А што ён нясе на плячах худых,
А што ён узняў на руках сухіх?
— Крыўду сваю.
А куды ж ён нясе гэту крыўду ўсю,
А каму ж ён нясе на паказ сваю?
— Свету вольнаму.
А хто ж яго гэта — які кат і закон —
У лёху ўзняў на дарожны сон?
— Лука-гора.
А чаго ж захацеў ён — стымул які —
Век пражыў у турме, сляпы і глухі?
— Прэзідэнтам звацца.

**Пітэказорная, дарожная**

Мы — пітэкантрапы будучыні,
Гісторыі новай цягло.
Вароты ў дзеі адчынены.
У дарогу! Да зорных сцягоў!

Гы-гы-гы! Го-го-го!
Мы да зорных йдзем сцягоў!

Доўга пуцямі блуднымі
Хадзілі нашы дзяды.
Дзярмом кантынент залюднілі
І род завялі ў нікуды.

Гы-гы-гы! Ды-ды-ды!
Завялі нас у нікуды!

Далоў эпохі пройдзены,
Далоў Адамаў род!
З вечнай мярзліны адродзім мы
Пітэкародны плод.

Гы-гы-гы! Лоп-лоп-лоп!
Мы адродзім мёртвы плод!

І будзе адзіная нацыя,
Грымі перамогі гром!
Жыве пітэка-рацыя,
Жыве пітэка-дом!

Гы-гы-гы! Ком-ком-ком!
Шырэй крок у пітэка-дом!

# Занатоўкі

* * *

Абсурд — рухаючая сіла прыроды.

* * *

Клінтан, караючы Мілошавіча, раструшчыў бомбамі Югаславію і адказнасць за ўчыненае варварства ўсклаў на цвёрдахрыбетнага неслуха.

Стварыў новую дактрыну.

* * *

Як ляпнула амерыканская „Свабода”, хто спачувае сербам, той здраднік цывілізацыі.

Ужо і цывілізацыю клінтанізавалі.

* * *

Пашырыўшы НАТА, мы атрымалі чэшскі флот і польскую авіяцыю, — лічыць амерыканскі падаткаплацельшчык.

* * *

Амерыка выбірае тых, хто ім падабаецца, а не тых, хто карыстаецца папулярнасцю ў асобна ўзятай краіне,

— зрабілі выснову амерыканскія палітолагі.

* * *

З выпадку дня нараджэння Ельцына амерыканскі прэзідэнт прэзентаваў яму каўбойскія боты. Барыс Мікалаевіч не ўлавіў падвоху, прыняў прэзент з душэўнай радасцю і запрасіў заакіянскага лідэра ў рускую лазню (найвышэйшы знак прыязні). А Клінтан намякаў: ты не прэзідэнт, ты — каўбой.

* * *

Ельцын падзякаваў Сцяпашыну за добрую работу (80 дзён) і адправіў спраўнага прэм'ера ў адстаўку.

— Служу Ельцыну! — сказаў Сцяпашын.

Служы пану верне, то ён табе перне.

* * *

— Камандавацъ парадам буду я! — гаварылі сціпла легендарныя маршалы, ідучы на чарговую ваенную гульню забавалюбнага генералісімуса.

* * *

Ужо старажытныя грэкі лічылі юродзівасць кантачаннем з багамі. Было яно пакараннем або ўзнагародай. На думку Сакрата, паэтычная творчасць — выразная праява псіхічнай хваробы. Сярод выдатных мысляроў і вучоных нямала чокнутых.

* * *

— Кожны пісьменнік з'яўляецца ў нейкай ступені яўрэем, — сказаў ізраільскі літаратар Д. Гросман, і патлумачыў:

— Яўрэйская схільнасць да абстракцыі спрыяе літаратурнай працы. З гэтай схільнасцю вяжацца пачуццё вечнага адчужэння, нават ва ўласнай сям'і, і перакананне, што наша гісторыя была сапраўды вялікай эпапеяй, нашым скарбам і адначасова няшчасцем.

* * *

— Чалавек — твор і творца хлусні, — цвердзяць генетыкі. — Мы толькі абгортка для нашых генаў.

* * *

— Жывем у бясконцай ночы, — сказаў крот, адкрываючы нам вочы на зямное ваколле. Стаў астрафізікам.

* * *

— Якую ноч успамінае Ельцын?

— Белавежскую.

* * *

— Калі Бог хоча каго пакараць, ажыццяўляе яго мары, — сказаў павернуты марксіст і перастаў марыць.

* * *

— Атэіст, але не ваяўнічы, — ачышчаўся на споведзі Барыс Мікалаевіч.

* * *

— Хараство часта суседнічае з цемрай, — сказаў Бальтасар Маралес, навучаючы дзікуна на безыменнай выспе іспанскай мове.

* * *

— Дарвін вельмі падобны на нас, толькі без хваста, — сказала малпа, назіраючы за даследчыкам.

* * *

Гісторык — прафесійны скажальнік фактаў.

* * *

Пастыр народа — рэлікт эпохі стаднага жыцця.

* * *

Бізун і пернік — прэтэндэнты на вечнасць.

* * *

— Пагана без зубоў, — сказаў стары канібал і, варочаючы крутымі сківіцамі, пачаў марыць аб стальных клыках.

* * *

— Чаму так жорстка абыходзяцца людзі з людзьмі? — здзіўляўся шакал, даследуючы пасля адгрымеўшай бітвы поле бою.

* * *

Калі Эйнштэйн уцяміў, у якую знішчальную сілу ўпрэгчы могуць ягонае $E = mc^2$, сказаў: „Лепш бы я стаў кавалём”.

* * *

Паводле аналітыкаў мазгавога трэста ЗША, вайна з'яўляецца агульным сацыяльным сродкам для рассейвання ўсеагульнай нуды.

* * *

Знаўцы пішуць, што надыходзіць эра войнаў інфармацыйных. Інакш — тэхнатронных або псіхагенных. Будзе разбурацца душа чалавека. Уключыць навяаўлены кесар які-небудзь генератар пэўных ваганняў і задзейнічаныя жыхары аддадуць захопнікам усё, што трэба, самі.

Во будзе забава!

* * *

Падкраліся ваўкі пад вёску і наставілі вушы на гаворку людзей. Ажно чуюць: „Чалавек чалавеку — воўк”. Абражаныя, вырашылі абярнуць пачутае. Нічога талковага не выйшла, бо воўк і чалавек непараўнальныя. Воўк ваўку не зробіць таго, што чалавек — чалавеку. Укантэнтаваныя высновай, ваўкі завылі любасна і, аджартоўваючыся, пакіравалі ў лес.

* * *

Дзікія зверы найбольш ненавідзяць людзей, людзі — сваіх суседзяў.

* * *

Вязень, сузіраючы свет праз турэмнае акенца, верыць,
што сонца ўзыходзіць і заходзіць.

* * *

Афрыканскі царок дазволіў гаварыць праўду. Гэтым парушыў адвечны закон уладароў: „Хто гаворыць праўду, не памрэ ад хваробы”.

* * *

— Эх, каб уставіць людзям у мазгі, замест першабытных звілін, электронныя! — разважаў у доўгія бельведэрскія ночы Вялікі Электрык. — Ведаў бы, аб чым народ думае.

* * *

Прэм'ер люстраваў творцаў: пакутуюць ад палавога бяссілля і курынай слепаты — не ўбачылі шанцаў, якія адкрыла ім новае прышэсце, не ўславілі з'яву. І ўшанаваў ордэнамі мастацкіх лізаблюдаў старога рэжыму.

* * *

Пакідаючы прэзідэнцкі палац, Валэнса напісаў запавет:
„Нельга крыўдзіць тых, хто не заслужыў на крыўду”.
Паставіўшы кропку, падумаў і дапісаў:
„Я за, і нават супраць”.
На другі дзень вярнуўся і патлумачыў:
„Я аптыміст, і нават песіміст”.

* * *

Чэслаў Кішчак аб перамовах з апазіцыі!:

„W pełni zdawałem sobie sprawę z tego, że wypuszczamy diabła z butelki, do której nikt go z powrotem nie zagoni, że Polska po Okrągłym Stole będzie już inna, lepsza".

Валенрод у скуры шэфа МУС?

Жыццяпіс — апісанне найлепшых бакоў свайго жыцця.

* * *

— Пара канчаць польска-польскую вайну! — усміхаючыся да лідэра AWS, прапанаваў лідэр SLD. — Давайце, заключым мір! Нават з хрэсным цалаваннем, — падкрэсліў.

— Я за мір! — з ухмылкай адказаў дучэ AWS і, узняўшы катэгарычна валявы падбародак, дадаў: — Але SLD трэба знішчыць!

* * *

Лозунг дня: Жыць па-брацку, як Каін з Авелем!

* * *

— Чамусьці для нас Бог паскупіўся на цвярозыя галовы,— пажаліўся стражніку спікер думы эннага склікання.

— Трэба закрыць буфет, — параіў стражнік.

* * *

Учарашнія цэрберы развітога сцірання нацыянальных граней абярнуліся ў ахоўнікаў гонару лайдачкай нацыі.

* * *

Маральны аўтарытэт — асоба, якая стаіць на „праведным" баку.

* * *

— Мінулае цягне ў крайнасці,— сказаў учарашні старшыня аб'яднання атэістаў, ачоліўшы паломніцтва на святую гару.

* * *

Стражнікі „рэвалюцыйнай чысціні" пільныя. У выгадны для сябе момант гавораць „Стоп!" І часта становяцца сумленнем нацыі, рэдка — прайграюць.

* * *

Змагацца з цемрай немагчыма. Яна непраглядная і неахопная.

* * *

Адвеку спіць — тутэйшы народ.

* * *

Стаіць на раздарожжы — беларус. Чаго ён хоча? Чалавекам звацца?

* * *

— Час працуе не на карысць самастойнага этнасу, — сказаў наш даследчык і, падумаўшы, дадаў: — Трэба спыніць час.

* * *

— Беларус па ўласнаму жаданню не стане беларусам, — сказаў наш патрыёт і пачаў караць правініўшагася сына „белавежцамі” — прымушае чытаць іхнія творы ў арыгінале.

* * *

— Усё вялікае пачынаецца з малога, — сказаў клешч, упіўшыся ў цела генія.

* * *

— Калі Зеўс гневаецца, значыць, Зеўс не мае рацыі, — гаварылі старажытныя мудрацы.

Бы сказана пра нашых Зеўсаў.

* * *

Нашы арлы ўгнездзіліся на маральнай вышыні і з пачуццём уласнай перавагі над задрыпанымі невукамі з праваслаўнай вёскі, на ўсё глухія, вушы наставілі толькі на воплескі.

* * *

Кусай сваіх, каб юргелі баяліся.

* * *

Былы старшыня ГП БГКТ, пакідаючы ганаровы пост, забраў з сабою і былыя ідэі.

* * *

— Ні ўзад, ні ўперад! — назіраючы проціборства шчупака і рака, паківаў галавою лебедзь і, уключыўшы ў крылы рэактыўную цягу, перанёс драўляны воз са сварліўцамі ў завоблачны скансэн.

* * *

— Меншым наканаваны лёс спадарожнікаў вялікіх, — успомніла закон прыцягнення калючка і атабарылася на хвасце вярблюда.

* * *

— Уладарамі дум сталі футбалісты, — зрабілі выснову нашы мысляры і стварылі футбольную дружыну .Дума дум”.

* * *

— Каб быць арыгінальным, трэба многа думаць і мала чытаць, — схапіў думку Байрана наш пачатковец і, каб стаць суперарыгінальным, перастаў наогул чытаць, нават сябе.

* * *

— Жыву ў імгле, — падумаў інжынер Барыс Руско.

Прасеяў імглу і стаў паэтам.

* * *

— Не багі гаршкі лепяць, — сказаў гаршэчны майстар і ўключыўся ў конкурс на замяшчэнне пасады начальніка саганнай гільдыі ў пекле.

* * *

Не цярпеў спеху. Перш чым адправіцца на той свет, загадзя правёў разведку.

* * *

За памяркоўную цану згадзіўся ачысціць ад шкоднай энергіі пекла.

* * *

— Праблема будзе вырашана, калі мы ўсе вырашым яе вырашыць, — сказаў наш палітык і ўвайшоў у цытатнае абарыгенных шчалкапёраў.

* * *

— Усе мы жывем у свеце ілюзій, — сказала Алачка Азаронак і выйшла замуж за падношанага бізнесмена.

* * *

Навязаць камусьці сваю думку — хварэць на пана.

* * *

Перамовы з каменем за пазухай — сіндром слабасці.

* * *

Адмовіцца ад свайго — палёт у бездань з нераскрытым парашутам.

* * *

Адкрыць свой боль — прынесці камусьці радасць.

Змрочныя хмары завіслі над мовамі. На Зямлі каля 6 тысяч моў. І 90 працэнтаў асуджана на знікненне ў самым недалёкім будучым. Штогод знікае ў сярэднім 12 моў, а ад 25 да 50 працэнтаў практычна не выкарыстоўваюцца ў штодзённым жыцці Так кажуць мовазнаўцы. Такі рухальны працэс сродка чалавечых зносін. Якое месца ў ім займаем мы?

* * *

— Татальны крызіс стабілізаваных азадкаў выціснуў у крэслы дух нацыі, — заўважыў наш сацыёлаг і прапанаваў дэстабілізаваць азадкі.

* * *

Заціснуты ў сябе, маўкліва сядзеў сіднем. І выседзеў гемарой.

* * *

Шмат ідэй раілася ў ягонай галаве. Выраілася галавакружэнне.

* * *

Пісаў крывёю і слязьмі. Атрымалася шэрая дылогія.

* * *

Па настаянні ўласнага одуму напісаў данос на сябе.

* * *

Ваенных задаткаў не меў. Стаў міністрам абароны.

* * *

12 сакавіка 1999 г. у бібліятэцы Трумэна размарозіўся міністр замежных спраў Б. Герэмак:

— Dla nas dopiero teraz zakończyła się zimna wojna! — аб'явіў раскутаму свету.

Цікава, калі размарозіць сваё сэрца наш В. Стахвюк? Вусны ўжо расшнураваў.

* * *

Каб стаць вялікім, даказваў, што ён з пігмеяў.

* * *

Ішоў на Галгофу, узышоў на п'едэстал.

* * *

Сціплы чалавек — шэры, без прэтэнзій на яркасць.

* * *

Маньяк у эйфарыі — чакай паклёпу.

* * *

Ашалом на трыбуне — чакай бяды.

* * *

Сустрэча тэт-а-тэт — уцёкі ад лупатых вачэй суседа.

* * *

Страціць розум — раўнаваць, як Атэла. 108

* * *

Мроя паклоннікаў Мэрылін Манро — павялічыць габарыты бюста да сусветных памераў.

* * *

Яна ўцягвала яго ў свае сны. Прачнулася на дзевятым месяцы.

* * *

Ён жыў зусім у іншым свеце, чым яна. І ад іх нарадзіліся астранаўты.

* * *

— Кожнае каханне павінна дайсці да свайго абсурднага канца, — даказваў наш сексуолаг і стаў аўтарытэтным правідцам.

* * *

З-за недахопу ходкіх тавараў гандляваў сваім сумленнем.

* * *

Дэпеша з таго свету: „Не памыляюцца толькі тыраны”.

* * *

Вучыся на чужых памылках, на тваіх — хай вучацца іншыя.

* * *

Калі не можаш стаць майстрам, стань прэзідэнтам.

* * *

Вялікі чалавек, які не можа смяяцца з сябе, з'яўляецца малым чалавечкам.

* * *

Тэатр пачынаецца з вешалкі, паэзія з рытмікі, а нас бусел прынёс.

* * *

Зблякла фантастычная белетрыстыка. Найбольшымі фантастамі сталі вучоныя. Як сцвярджае амерыканскі прафесар А. Балонкін, вялікімі крокамі надыходзіць час, калі чалавек набудзе неўміручасць. У выглядзе электроннай Е-істоты. Існуе закон узрастання складанасці сістэм. Яны самакапіруюцца, пры пастаянных вонкавых умовах. У дадзены момант размяшчаем на квадратным сантыметры чыпа сотні тысяч і мільёны электронных элементаў. У бліжэйшыя гады гэта лічба ўзрасце ў тысячы разоў. І будзе расці далей. Чалавечы мозг мае 10 мільярдаў нейтронаў. Яны лёгка мадэлюруюцца. Як толькі зможам змадэліраваць усе нейтроны і навучымся перапісваць іх сувязі ў чыпы, чалавек стане неўміручым. Чалавек як асоба — паясняе прафесар — гэта не больш, чым памяць, праграмы, звычкі. Перапісаўшы ўсю гэту інфармацыю ў чыпы, мы даем яму магчымасць існавання ў новым, электронным абліччы.

— Чалавек у выглядзе чыпа альбо скрынкі, начыненай электронікай? — скрывіўся Сідар.

No problem! Вы зможаце выбраць свой воблік па жаданні — ад Шварцэнегера да Мэрылін Манро. Вы не будзеце мець патрэбы ў ежы, жытле, паветры. Будзеце непадвержны любой зброі. Запіс мозгу можна захоўваць у чыпе і ў выпадку катастрофы ўзнавіць у новым целе.

— Як у той песні! — увайшоў у захапленне Сідар. — Надавишь кнопку — чик-чи-рик — и человек готов!

У электроннага чалавека будуць неабмежаваныя магчымасці ў сэнсе яго навучання і развіцця. Навучанне будзе займаць секунды. Роўна столькі, колькі займае перапіс інфармацыі з чыпа ў чып. Спатрэбілася кітайская мова — цераз пару хвілін вы ўжо размаўляеце лепш за біялагічнага кітайца. Неабходны суперкамп'ютэр магутнасцю ў адзін тэрафлоп — тысяча мільярдаў аперацый у секунду. Зроблены першыя крокі. Фірмай „Інтэл" створаны першы чалавека-эквівалентны камп'ютэр (ЧЭК). Прыкладна да 2030 года будзе створаны суперкамп'ютэр, магутнасць якога пераўзыдзе магутнасць мазгоў усяго чалавецтва. Прагноз: у 2020-2030 гадах неўміручасць стане даступнай для жыхароў развітых краін, а яшчэ праз 10-20 гадоў і для асноўнай масы чалавецтва.

І мяне там не будзе! Замарозіцца, пачакаць?

— Не толькі недарэчнае вынаходзяць людзі! — падсумоўваючы пачутае, ухваліў качар Дональд.

© OCR: Камунікат.org, 2013
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2013
© PDF: Камунікат.org, 2013

**Змест**

**На абмежку**
Яна недзе ёсць
Шукальнік алмазнага свету
Крылатыя словы Барскага
Твая любоў — твая загуба
Дарунак восьмага неба
Трасуны
Ваенная хітрасць

**Калі я быў не я**
ГУЛАГавец
Монтэкасінец
Дыпламат
Інжынер
Першая пальчатка Польшчы
Правакатар
Памешчык
Багатыр
Інжынер II
Педагог

**Мройнае віраванне Сідара Макацёра**
Год апалоніка
О часы, о норавы!
13 смярцей
Неспазнаныя шляхі твае
Жахлівая папка
Чыім вучнем быў Сталін
Як расплаўлялася сталь
Пярэкрут у пекле
Пад уладай дылетантаў
Адхіленне глуздоў
Цыклафрэнія
Чалавек — зло
З Новага Свету
Комплекс лідэраў
Ці хочуць пацукі вайны?
аНАТАцыя
Давай цэнтр Еўропы!

Плячо ў плячо з прэзідэнтам
Палякі па выбару
Фалас лунае над Сеймам
Рэквіем Леаніду
Куды ідзем?
Загуменне
Хто мы такія?
Флюгер
Сценька Разін сатаніст
Зямляк
Брусельская вуліца
Патэнцыял немачы

**З сябравіцкага тэлетайпа**
Дзедзічы цемры
Паддоследны
Учарашні
Спазнай сябе
Па катэхізісу Бэлзы
Зварот Івана Кірызюка да Бога, або Як цяжка беларусу быць украінцам
Пан Філюк
Ачалавечыліся
Герой
Па старой звычцы
Настрашыла
Крыноцкі роздум
На Русі
Пад Купалу
Пітэказорная, дарожная
Занатоўкі
Фотахроніка